Тавары з Беларусі прадаюцца ў розных краінах. Але нашы прадпрыемствы па-ранейшаму не застрахаваны ад вытворча-гандлёвых непрыемнасцяў, выкліканых непартнёрскімі паводзінамі. СТАР 2

Расклад руху пасажырскіх цягнікоў па станцыі Мінск-Пасажырскі на 2012—2013 гады. СТАР 6

Па традыцыі, на другі дзень Троіцы ў вёсках пачыналіся гульні: выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, рабілі яе Кустом і вялі праз усё сяло. Ды нікога не міналі, бо Куст сімвалізаваў род, радавод. СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 105 (27220) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ОРДЭНАМ МАЦІ ЎЗНАГАРОДЖАНЫ 23 ШМАТДЗЕТНЫЯ ЖАНЧЫНЫ З РОЗНЫХ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ

За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей ордэнам Маці ўзнагароджаны 23 шматдзетныя жанчыны з розных рэгіёнаў Беларусі. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 4 чэрвеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Сярод удастоеных узнагарод бухгалтар Полацкага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сельскагаспадарчай вытворчасці Зоя Булаўка, аператар машыннага даення ААТ «Талачынскі райаграсэрвіс» Алеся Крывецкая, работніца эксперыментальнай лесапаляўнічай гаспадаркі «Ляскавічы» ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» Вера Барысава, участковы ўрач-педыятр Мазырскай гарадской дзіцячай бальніцы Святлана Калеснік, хатняя гаспадыня з вёскі Новы Двор Свіслацкага раёна Вера Ганчарэвіч, палявод сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Макараўцы» Бераставіцкага раёна Алена Мілашэўская.

Валянціна МАЦВІЕНКА:

«Першыя вынікі сведчаць, што створана правільная структура»

Учора ў рамках візіту парламенцкай дэлегацыі Расійскай Федэрацыі ў Беларусь адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Анатоля Рубінава са Старшынёй Савета Федэрацыі Валянцінай Мацвіенка. Пасля перамоў было падпісана новае пагадненне аб супрацоўніцтве паміж верхнімі палатамі парламентаў абедзвюх краін.

Анатоль Рубінаў назваў гэты візіт знакавым, у ліку тых, што вызначаюць новы этап у развіцці адносін паміж Беларуссю і Расіяй. Невыпадковым быў і першы візіт Уладзіміра Пуціна ў Беларусь у якасці прэзідэнта. Усе гэта сведчыць, на думку Старшыні Савета Рэспублікі, пра «глыбока асэнсаваную надзённую, стратэгічную неабходнасць вяртання да саюзных адносін»,

— Кажуць, у раку гісторыі не ўваходзяць двойчы, — сказаў ён, — ніхто і не збіраецца аднаўляць і паўтараць мадэлі мінулых часоў, але і забываць іх — не дастойна нашых народаў... Важна, каб кожная краіна паасобку і саюз краін клапаціліся пра сваю ўстойлівасць, эканамічную моц і ваенную абарону, пра годнае месца ў свеце. Асэнсаванне гэтага і прывяло да інтэграцыйных утварэнняў.

Анатоль Рубінаў падкрэсліў, што роля парламентаў у гэтых працэсах магла б быць больш актыўнай.

Фота БЕЛТА.

Валянціна Мацвіенка пагадзілася з беларускім калегам і ў сваю чаргу падкрэсліла, што Расія вельмі сур'ёзна настроена на далейшае паглыбленне стратэгічнага партнёрства з Беларуссю.

— У нас няма ніякіх праблемных пунктаў, ніякага непаразумення, — сказала яна. — Намечана праграма шырокага супрацоўніцтва ў эканоміцы, палітыцы, каардынацыя нашых намаганняў па сусветных праблемах, у абароннай і ваенна-тэхнічнай сферах. У Расіі візіт Пуціна ў Беларусь ацэньваюць як вельмі паспяховы. Безумоўна, мы зацікаўлены ў развіцці не толькі двухбаковага фармату, але Расія і Беларусь сталі пачаткам інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы. Любы палітык сёння разумее, што гэта не сітуатыўнае памкненне, а сусветны трэнд да аб'яднання намаганняў дзяржаў, бо ў нашым імклівым глабальным свеце адна краіна не можа быць канкурэнтаздольнай і не можа выжываць сама па сабе. СТАР 2

ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ БЕЛАРУСКАГА ДОМА

Яны зноў прагучалі ў Гродне на IX Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур

Працы майстроў з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Літвы, Польшчы, Расіі ўвайшлі ў так званае «Покрыва Свету» — вялізнае палотнішча, якое па традыцыі апошніх фестываляў праносяць падчас тэатралізаванага шэсця. Прычым, з кожным разам яго памеры павялічваюцца — сёлета на некалькі дзясяткаў новых фрагментаў. Кожны з іх — быццам сведчанне павагі, прызнанне ў любові да Беларусі. І тут не патрэбны нейкія гучныя фразы — дастаткова акунуцца ў фестывальную атмасферу ды насыціцца духам горада над Нёманам. СТАР 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ТОЗІК, намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь:

«Паводле розных ацэнак, сёння за межамі краіны пражываюць да 3,5 млн беларусаў у першым, другім, трэцім пакаленнях. Большасць з іх памятае аб сваёй гістарычнай радзіме, і, безумоўна, нам, як і любой дзяржаве, важна, каб гэтыя сувязі захоўваліся... Суайчыннікі забяспечваюць нам падтрымку ў розных арганізацыях, нясуць аб'ектыўную інфармацыю, і такія стасункі павінны быць узаемнымі».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 15°
Віцебск	+ 18°
Гомель	+ 20°
Гродна	+ 16°
Магілёў	+ 16°
Мінск	+ 15°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.06.2012 г.

Долар ЗША	8390,00	▲
Еўра	10420,00	▲
Рас. руб.	246,50	▼
Укр. грыўня	1038,08	▲

КАГО І ЗА ШТО МОГУЦЬ ВЫСЕЛІЦЬ З КВАТЭРЫ?

Дэпутаты патлумачылі палажэнні новага Жыллёвага кодэкса

Прыняты дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў у другім чытанні праект новага Жыллёвага кодэкса змяшчае мноства новаўвядзенняў. У прыватнасці, сур'ёзныя змены датычацца практыкі высялення грамадзян. Новым законапраектам прадугледжана магчымасць прымусовага высялення не толькі найманых, які пражывае ў дзяржаўнай кватэры, але і ўласніка жылля.

Гэта тычыцца выпадкаў, калі маецца шасцімесячная запазычанасць за жыллёва-камунальныя паслугі (без уважлівых прычын), невыкананне абавязкаў па ўтрыманні жылога памяшкання, якое робіць немагчымым пражыванне побач іншых людзей у доме, кватэры. Акрамя таго, будзе магчыма высяленне ўласніка, калі ён тры і больш разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці і парушаў грамадскі правапарадак.

— Парушэнні тычацца толькі правілаў пражывання ў жылым памяшканні, — паведаміла на прэс-канферэнцыі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Галіна ПАЛЯНСКАЯ,** каментуючы праект дакумента. — Жыллёвы кодэкс рэгулюе жыллёвыя адносіны. Таму, калі вы тры разы перайшлі вуліцу ў неналежным месцы, ніхто з кватэры вас выселіць не зможа.

Але ў цэлым выселіць уласніка, па словах Галіны Палянскай, усё ж будзе няпроста. Напрыклад, чалавек тры і больш разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці або 6 месяцаў не плаціць за кватэру. Механізм высялення выглядае так: выканаўчая ўлада папярэджвае грамадзяніна ў пісьмовай форме. На працягу месяца ён павінен адрэагаваць. Калі гэтага не адбываецца, выканаўчыя органы падаюць у суд на адчужэнне кватэры. Далей чалавеку даецца шанц: на працягу года ён павінен альбо пагасіць сваю запазычанасць, альбо выправіцца. І толькі па сканчэнні 12 месяцаў, калі не адбудзецца станоўчых змен, можна весці гаворку аб прымусовым продажы жылля. Частка атрыманай ад продажу жылля сумы пойдзе на пагашэнне запазычанасці, а на астатнія грошы грамадзяніну будзе куплена іншае жыллё (неабавязкова ў тым жа населеным пункце).

* * *

Яшчэ адно новаўвядзенне: праект Жыллёвага кодэкса абавязвае загадзя інфармаваць грамадзян аб правядзенні работ па капітальным рамонце жылога дома. Спісы жылых дамоў, якія падлягаюць капітальнаму рамонту, будуць зацвярджацца і публікавацца ў СМІ да 1 лютага.

— Цяпер на заканадаўчым узроўні прапісана, што складаць графік работ на бягучы год і інфармаваць грамадзян неабходна загадзя, а таксама — абавязкова падпісваць з жыхарамі дагавор на аказанне паслуг па капрамонце, у якім будуць распісаны дзеянні арганізацый, якія робяць капрамонт, тэрміны заканчэння работ і іншае, — заявіў на прэс-канферэнцыі **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса Эдмунд ГРЫШКЕВІЧ**. — Юрыдычнае рэгуляванне гэтых пытанняў дасць магчымасць больш дакладна арганізаваць правядзенне капітальнага рамонту жылога фонду, а жыльцам — магчымасць абараняць свае правы ў судзе, калі пункты дагавора не выконваюцца. Таксама праектам дакумента вызначаны падставы, згодна з якімі неабходна правядзенне капрамонту дома.

Наогул, па словах Галіны Палянскай, у новай рэдакцыі Жыллёвага кодэкса зроблены крок наперад па выхаванні ў грамадзянах адказнасці не толькі за ўласнае жыллё, але і ў цэлым за жылое асяроддзе. Бо пры сумесным домаўладанні ў шматкватэрным доме кожны адказвае не толькі за ўласную кватэру, але і за частку дапаможных памяшканняў, прыдамавой тэрыторыі, якой ён таксама валодае.

Святлана БУСЬКО.

ЗАВОЧНАЯ ПРАМАЯ ЛІНІЯ

ШТО ТАМ З СЭРЦАМ?

Да 8 чэрвеня па рэдакцыйным нумары **8 (017) 292 21 03** пакідайце, калі ласка, свае пытанні да **загадчыцы інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, урача-кардыёлага вышэйшай катэгорыі Наталлі Якаўлеўны ПАЛЯЎКОВАЙ** і **ўрача-кардыёлага блока інтэнсіўнай тэрапіі той жа ўстановы Ірыны Віктараўны ГРЫШЫНАЙ**. Спецыялісты адкажуць на старонках «Звязды».

РАБОЧЫ ДЗЕНЬ З ПАНЯДЗЕЛКА 2 ЛІПЕНЯ ПЕРАНОСІЦЦА НА СУБОТУ 30 ЧЭРВЕНЯ

У Беларусі пераносіцца рабочы дзень з панядзелка 2 ліпеня 2012 года на суботу 30 чэрвеня. Такое рашэнне прынята пастановай Савета Міністраў ад 1 чэрвеня 2012 года № 515, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.

Гэтым дакументам прадастаўлена права арганізацыям рэспублікі з улікам іх спецыфікі вытворчасці (работы) пераносіць рабочы дзень у іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

ЧАКАЕЦЦА ЎМЕРАНА ЦЁПЛАЕ ЛЕТА

Аб гэтым паведаміў на брыфінгу начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Лета будзе халаднейшае, чым у 2011 і 2010 гадах. Такое лета, як у мінулым годзе, бывае прыкладна раз у 15 гадоў. Такога гарачага лета, як у 2010 годзе, яшчэ не было ў краіне ні разу. Сярэдняя тэмпература паветра чакаецца каля кліматычнай нормы, якая ў сярэднім складае 16,8 градуса. Колькасць ападкаў таксама чакаецца ў межах нормы. Гэтым летам у цэлым чакаецца няўстойлівы характар надвор'я, без спёкі таксама не абыдзецца. Яе будуць забяспечваць блакіруючыя антыцыклоны, аднак жыць яны будуць нядоўга, па 5-7 дзён. Усяго чакаецца некалькі хваль спёкі. Начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў таксама паведаміў, што прагноз надвор'я на суткі ў сярэднім апраўдваецца на 95-96 працэнтаў, на трое сутак — на 87-90 працэнтаў, на тыдзень — на 85-87 працэнтаў, на месяц — прыкладна на 70 працэнтаў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЕЎРАКАМІСІЯ РЭКАМЕНДУЕ ЛІТВЕ ПАВЫСІЦЬ ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ І НЕКАТОРЫЯ ПАДАТКІ

У рэкамендацыях Еўракамісіі, прадстаўленых краінам — членам Еўрасаюза, Літве прапанавана павысіць пенсійны ўзрост, падаткі на нерухомасць, іншыя падаткі і знізіць беспрацоўе.

Пакет эканамічных прапаноў Еўракамісіі павінен дапамагчы краінам ЕС правесці рэформы, неабходныя для дасягнення фінансавай і эканамічнай стабільнасці. Літве, акрамя іншага, рэкамендавана дасягнуць збалансаванага бюджэту і павышэння эфектыўнасці энергетычнага сектара. Як паведамляе прэс-служба Міністэрства замежных спраў, у Брусэлі заўважылі намаганні Літвы па рэфармаванні пенсійнай сістэмы і ў пераадоленні бюджэтнага дэфіцыту, станоўча ацаніўшы эканамічныя дасягненні Літвы. На думку Еўракамісіі, літоўская эканоміка ў крызісным Еўрапейскім саюзе сёлета ўвойдзе ў лік тых, што раслі найхутчэй — яна зойме другое месца пасля Польшчы. Паводле прагнозаў, рост літоўскай эканомікі ў бягучым годзе складзе 2,4%.

ЛЕВЫЯ І НЕАНАЦЫСТЫ ПАРАНІЛІ 38 ПАЛІЦЭЙСКІХ ПАДЧАС СУТЫКНЕННЯЎ У ГАМБУРГУ

Падчас сутыкненняў паміж левымі і неанацыстамі, якія адбыліся ў Гамбургу 2 чэрвеня, пацярпелі 38 паліцэйскіх. Пра гэта, як паведамляе агенцтва Франс Прэс, заявіла нямецкая паліцыя. У супрацоўнікаў праваахоўных органаў кідалі камяні, бутэлькі і фаеры, у адказ на што паліцыянты выкарысталі супраць пратэстуючых вадзяныя гарматы і пярцовыя балончыкі. Акрамя таго, як мінімум тры аўтамабілі (у тым ліку адзін паліцэйскі) былі падпалены невядомымі. Апоўдні 2 чэрвеня каля 700 ультраправых дэманстрантаў сабраліся ў Гамбургу на ўзгоднены марш, паведамляе Die Welt. Яны не змаглі прайсці па запланаваным маршруце, бо ім закрылі шлях ультралевыя — усяго іх было каля 3,5 тысячы чалавек. Усяго акцыю ахоўвалі 4400 паліцэйскіх. Падчас сутыкненняў былі затрыманы 63 чалавекі, яшчэ 17 — арыштаваны.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

СОРАС ДАЎ ЕЎРОПЕ ТРЫ МЕСЯЦЫ НА ПЕРААДОЛЕННЕ КРЫЗІСУ

Інвестар-мільярдэр Джордж Сорас лічыць, што ў Еўропы засталося толькі тры месяцы на выратаванне адзінай валюты. Такую заяву Дж.Сорас зрабіў на Фестывалі эканомікі, які праходзіць у італьянскім горадзе Трэнта, паведамляюць інфармагенцтвы. «Праз тры месяцы рынкам надакучыць чакаць. Яны пачнуць патрабаваць усё большага, але ўлады не змогуць задаволіць іх патрабаванні», — сказаў знакаміты інвестар. Як ён растлумачыў пазней, пад уладамі мелася на ўвазе ўрад Германіі і кіраўніцтва Бундэсбанка.

Паводле ацэнак Дж.Сораса, да восені Германія вычарпае свой запас трываласці, і канцлеру Ангеле Меркель не ўдасца заручыцца падтрымкай насельніцтва тых высілкаў, якія краіна прыкладае для выратавання сваіх саюзнікаў. Менавіта таму тэрмін, адведзены Еўропе, заканчваецца на працягу трох месяцаў.

«Улады еўрапейскіх краін да гэтага часу не разумеюць прычыну свайго крызісу. Яны лічаць, што гэта бюджэтная праблема, у той час як гэта больш праблема банкаўскага сектара і праблема канкурэнтаздольнасці вытворчасці», — падзяліўся сваімі думкамі Дж.Сорас.

Для выратавання еўра, па словах Сораса, варта, па-першае, увесці страхоўку банкаўскіх дэпазітаў, каб спыніць масавы адток укладаў з банкаў. Акрамя таго, на думку інвестара-мільярдэра, еўрапейскім банкам неабходна забяспечыць доступ да прамога фінансавання з фонду Еўрапейскага механізму стабільнасці, які павінен запрацаваць у сярэдзіне лета 2012 года. Усе гэтыя захады, падкрэсліў Сорас, павінны спалучацца з увядзеннем агульнаеўрапейскіх інструментаў кантролю і рэгулявання.

Пры гэтым Сорас лічыць, што ў адзінай еўравалюты ўсё ж ёсць будучыня. «Верагоднасць таго, што еўра выжыве, высокая, таму што крушэнне адзінай валюты будзе мець негатыўныя наступствы не толькі для перыферыйных краін еўразоны, але і для Германіі, — сказаў ён. — Таму ўлады ФРГ зробяць усё неабходнае для захавання еўра, але нічога звыш гэтага». Дж.Сорас таксама закрануў тэму выхаду Грэцыі з еўразоны.

ШТО РОБІЦЕ АСАБІСТА ВЫ, КАБ НАШЫ ДЗЕЦІ ВЫРАСЛІ САПРАЎДНЫМІ ГРАМАДЗЯНАМІ, ФІЗІЧНА І ДУХОЎНА РАЗВІТЫМІ АСОБАМІ?

Раіса ВАЙЦЯХОЎСКАЯ, дырэктар Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці:

— Я ўдзячна лёсу, што мая работа звязана з выхаваннем дзяцей. Менавіта тут я магу дапамагчы раскрыць іх здольнасці, таленты. Наш калектыў аказвае хлопчыкам і дзяўчынкам падтрымку ў ажыццяўленні іх творчых планаў, задум. Мы вельмі ўдзячны Мінаблвыканкаму за тое, што заснаваў 10 намінацый у разнастайных творчых кірунках для дзяцей і моладзі, дзе любы калектыў можа атрымаць спецыяльную прэмію, грант. На маю думку, незалежна ад прафесіі, нават калі яна і не звязана з выхаваннем падрастаючага пакалення, кожны чалавек павінен імкнуцца рабіць як мага больш дабра дзецям. Для таго, каб ім у нашай краіне жылося камфортна і шчаслива, каб яны выраслі гарманічнымі асобамі, змаглі ажыццявіць свае мары.

Мікалай КУЛЕШ, першы намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама:

— Дзеці — гэта і радасць, і клопат, і вялікая адказнасць. Але менавіта ад таго, якімі іх выхаваем, залежыць не толькі наша будучыня, але і будучыня дзяржавы. На мой погляд, для дзяцей і падлеткаў адбудавана цэлая сістэма дзяржаўнага клопату. Для падрастаючага пакалення створаны ўсе неабходныя ўмовы для вучобы, адпачынку, фізічнага і духоўнага развіцця. Вось толькі адзін прыклад. У Міжнародны дзень абароны дзяцей, 1 чэрвеня, адкрыўся дзіцячы сад на 230 месцаў у такім густанаселеным пасёлку, як Бараўляны. У іншых рэгіёнах таксама робіцца ўсё магчымае, каб дзеці развіваліся і духоўна, і фізічна, будуюцца басейны, спартыўныя залы, пляцоўкі. Так што, на мой погляд, дзяржава клапоціцца, каб выхаваць кожнае дзіця патрыётам, грамадзянінам, сем'янінам.

Аксана ПАЧАСУЙ, педагог-псіхолаг сацыяльна-педагагічнага цэнтра Маскоўскага раёна г. Мінска:

— У сацыяльным дзіцячым прытулку на базе сацыяльна-педагагічнага цэнтра Маскоўскага раёна цяпер знаходзіцца 29 выхаванцаў ад 3 да 16 гадоў. У асноўным гэта тыя дзеці, чые бацькі злоўжываюць алкаголем і, як вынік, вядуць антысацыяльны лад жыцця. Таму дзяржава вымушана забіраць малых і змяшчаць у сацыяльныя прытулкі. У нас яны жывуць да шасці месяцаў. І калі за гэты час таты і мамы не сталі на шлях выпраўлення, то іх пазбаўляюць бацькоўскіх правоў. Бясспрэчна, расстанне з домам, біялагічнай сям'ёй дзеці пераносяць хваравіта. Справіцца з сітуацыяй ім дапамагаюць педагогі, псіхолагі, якія займаюцца з выхаванцамі як са сваімі роднымі дзеткамі, ладзяць экскурсіі, святы. Дзеці займаюцца ў творчых майстэрнях, гуртках па інтарэсах, летам адпачываюць у аздараўленчых лагерах. Створаны добрыя ўмовы для адпачынку, фізічнага і духоўнага развіцця малых. Дапамагаем і бацькам у вырашэнні праблем, звязаных з алкагалізмам, каб іх дзеці змаглі вярнуцца дадому, у біялагічныя сем'і. А калі гэтага не здараецца, то шукаем ім новых бацькоў.

Падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НАКІРАВАЎ СПАЧУВАННІ...

ПРЭЗІДЭНТУ НІГЕРЫІ Ў СУВЯЗІ СА ШМАТЛІКІМІ АХВЯРАМІ ПРЫ АВІЯКАТАСТРОФЕ Ў ЛАГАСЕ

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні Прэзідэнту Федэратыўнай Рэспублікі Нігерыя Гудлаку Джонатану ў сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі ў выніку авіякатастрофы ў горадзе Лагас. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

РОДНЫМ І БЛІЗКІМ НАРОДНАГА АРТЫСТА РСФСР ЭДУАРДА ХІЛЯ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ў сувязі са смерцю народнага артыста РСФСР Эдуарда Хіля накіраваў спачуванні яго жонцы Зоі Хіль, родным і блізкім. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Творчасць Эдуарда Анатольевіча — гэта цэлая эпоха ў развіцці савецкай і расійскай эстрады. Песні Эдуарда Хіля, любімыя не адным пакаленнем слухачоў, сталі сапраўды залатымі шлягерамі, заўсёды дарылі людзям радасць і добры настрой», — гаворыцца ў спачуванні. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, на беларускай зямлі Эдуарда Хіля высока цанілі за выдатны талент і адданасць мастацтву.

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ УРУЧЫЎ ДЗЯРЖУЗНАГАРОДЫ ЗАСЛУЖАНЫМ ЛЮДЗЯМ БЕЛАРУСІ

Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўручыў учора дзяржузнагароды заслужаным людзям Беларусі, перадае БЕЛТА.

У спісе ўзнагароджаных 111 чалавек. Гэта работнікі прамысловага комплексу, энергетычнай сферы, аховы здароўя, адукацыі, навукі, культуры. Яны ўдастоены ўзнагарод за шматгадовую плённую працу, дасягненне высокіх прадукцыйных і творчых паказчыкаў, асабісты ўклад у развіццё галін нацыянальнай эканомікі і сацыяльна-культурнай сферы.

Узнагароджваючы прадстаўнікоў прамысловага комплексу краіны, прэм'ер-міністр адзначыў іх уклад у развіццё беларускай эканомікі. Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў неабходнасць павышэння канкурэнтаздольнасці прамысловай прадукцыі, у тым ліку ва ўмовах Адзінай эканамічнай прасторы. «Гэта асноўны элемент рынкавых адносін, і гэта трэба ўлічваць у сваёй рабоце, — заявіў ён. — Усім вядомы 3 асноўныя паказчыкі канкурэнцыі — цана, якасць і сэрвіс».

Міхаіл Мясніковіч таксама падкрэсліў неабходнасць удасканалення аграрнай палітыкі ў Беларусі. «Экспарт сельгаспрадукцыі павінен вырасці да $7 млрд да 2015 года. Гэта тая аддача, якая павінна спрацаваць па выніках вялікіх уліванняў інвестыцый, прэферэнцый, якія дзяржава ажыццяўляе ў сельскую гаспадарку», — заявіў ён.

Звяртаючыся да прадстаўнікоў сацыяльнай і культурнай сферы, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што дзяржава будзе ўсяляк падтрымліваць гэтыя напрамкі. «Мы цэнім нашу культуру і мастацтва, і дзяржава будзе ўсяляк падтрымліваць творчых людзей. Мы ўдзячныя вам за прафесіяналізм і адказны падыход да справы», — заявіў ён.

Асаблівую ўвагу Міхаіл Мясніковіч удзяліў важнасці развіцця ў краіне аховы здароўя і адукацыі. Разам з тым ён падкрэсліў неабходнасць вырашэння пытання па забеспячэнні гэтых і іншых сфер высокакваліфікаванымі кадрамі.

У БЕЛАРУСБАНКА РОСТ ДОЛІ ПРАБЛЕМНЫХ КРЭДЫТАЎ НЕІСТОТНЫ

Беларусбанк спадзяецца ў 2012 годзе выйсці на станоўчыя вынікі па міжнародных стандартах фінансавай справаздачнасці (МСФС), калі дынаміка стабілізацыі ў краіне будзе захавана і надалей, заявіў Уладзімір НОВІК, намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк».

— У нашай краіне фінансавая справаздачнасць складаецца ў адпаведнасці з нацыянальнымі стандартамі, але адначасова ў банкаўскай сістэме (і нашым банку ў тым ліку) справаздачнасць складаецца і ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, каб быць зразумелым сваім замежным партнёрам, — тлумачыць **Уладзімір НОВІК**. — Мінулы год для нашай краіны і эканомікі быў асаблівым, бо міжнародныя аўдытарскія кампаніі прызналі нашу эканоміку гіперінфляцыйнай і рэкамендавалі прымяненне 29-га стандарту МСФС, які называецца «Фінансавая справаздачнасць у гіперінфляцыйнай эканоміцы». І такім чынам калі па нацыянальных стандартах у нас атрымаўся прыбытак у памеры каля 75 млн долараў, то з па МСФС — страта ў памеры каля 300 млн долараў.

Разам з тым, Уладзімір Новік просіць улічваць, што наша краіна з пачатку 90-х гадоў мае жорсткае дзяржаўнае рэгуляванне эканомікі і зараз знаходзіцца ў стадыі трансфармацыі, а значыць, рэальна ацаніць фінансавы стан з дапамогай стандартаў МСФС вельмі складана».

— Паколькі ў свеце не існуе абсалютнага падабенства падатковых і фінансавых сістэм, то, напэўна, стандарт МСФС не можа з'яўляцца стапрацэнтнай ацэнкай фінансавага стану, якую трэба прымаць як абсалютную ісціну. Неабходна таксама ўлічваць і макраэканамічнае асяроддзе, у якім існуюць суб'екты гаспадарання, — заўважыў ён і дадаў, што калі б не прымяняўся 29-ы стандарт, то ў Беларусбанка быў бы прыбытак і па міжнародных стандартах справаздачнасці.

У сваю чаргу **Андрэй ДАРАНКЕВІЧ, дырэктар дэпартамента ўнутранага аўдыту Беларусбанка**, дадаў, што ацэнка дзейнасці банка адбываецца не толькі па выніках фінансавай дзейнасці, але і па тым, які атрымаўся прыбытак ці страта:

— Улічваецца і шэраг нарматываў, у тым ліку і нарматыў дастатковасці капіталу. Тут неабходна адзначыць, што ён з'яўляецца ключавым у ацэнцы дзейнасці банка і паказвае, наколькі банк у крызісны перыяд, груба кажучы, не згубіў свой капітал. Дык вось наш банк на працягу крызіснага 2011 года, і зараз захоўвае нарматыў дастатковасці капіталу, устаноўлены Базельскім пагадненнем.

Інфляцыя — падарунак для тых, хто ўзяў ільготны крэдыт?

Журналісты пацікавіліся ў прадстаўнікоў Беларусбанка: як зараз ідуць справы з ільготным крэдытаваннем насельніцтва на будаўніцтва жылля і як на гэтыя крэдыты паўплывала абясцэненне беларускага рубля?

— Гіперінфляцыя для тых, хто атрымаў ільготны крэдыт, — сапраўдны падарунак лёсу ад дзяржавы. Але гэта ў выглядзе інфляцыйнага падатку распаўсюджваецца на ўсіх іншых удзельнікаў грамадства, якія нясуць пэўныя страты. Таму фарміраванне праграм па будаўніцтве жылля было перагледжана: рэзка скарочана кола асоб, якія могуць атрымліваць такія рэсурсы, — сказаў Уладзімір Новік і дадаў, што банк выконвае толькі працэдуру афармлення крэдытаў, а рэсурсы прадастаўляе дзяржава (пры гэтым прызнаўся, што для банка гэта прыбытковы бізнэс, бо ён атрымлівае сваю пэўную маржу). — Калі б дзяржава індэксавала кошт рэсурсаў, то, безумоўна, былі б вялікія праблемы — пачынаючы ад росту праблемных крэдытаў ў партфелі банка і заканчваючы праблемамі ва ўсіх, хто такі крэдыт атрымаў.

Намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк» мяркуе, што ў далейшым дзяржава будзе вельмі ўважліва ставіцца да льготнага крэдытавання жылля, бо «людзі павінны зарабіць на жыллё, а не будаваць яго за кошт дзяржавы ці крэдытнай эмісіі».

Што тычыцца дакрэдытавання, то людзі, якія маюць права на гэта, атрымаюць дадатковае фінансаванне. Тут Беларусбанк таксама выконвае функцыю пасрэдніка: рашэнні, каго дакрэдытоўваць, знаходзяцца ў кампетэнцыі органаў улады, рэсурсы на гэта таксама выдзяляе дзяржава.

Плаціць па рахунках трэба

Прадстаўнікі Беларусбанка расказалі журналістам, што доля праблемных крэдытаў у крэдытным партфелі банка з-за крызісу павялічылася нязначна:

— У пачатку мінулага года было вельмі шмат заяў негатыўнага характару ад экспертаў наконт росту долі праблемнай запазычанасці ў беларускіх банках — называліся лічбы ажно да 20-30%. Але практыка паказвае некалькі іншую карціну: сапраўды, рост праблемных крэдытаў ёсць, але ён неістотны і аб'ектыўна апраўданы на фоне крызісных з'яў — доля такіх крэдытаў не дасягнула нават 3% у крэдытным партфелі. А што тычыцца фізічных асоб, то тут доля і наогул знаходзіцца ў межах арыфметычнай хібнасці, — адзначыў Андрэй Даранкевіч.

Уладзімір Новік дадае, што такія паказчыкі дасягнуты дзякуючы жорсткай працэдуры прыняцця рашэнняў аб выдачы крэдытаў — пачынаючы ад адзінай базы ўсіх пазычальнікаў і заканчваючы жорсткай працэдурай выдачы крэдыту і яго суправаджэння:

— Калі пазычальнік губляе магчымасць выплачваць крэдыт, то яму мала не пакажацца: у нас дастаткова механізмаў і інструментаў для гэтага, у тым ліку і абмежаванне выезду за мяжу. Таму ў нас усе стараюцца плаціць крэдыты своечасова. Гэта, можна сказаць, менталітэт беларускага народа — калі ўзялі, то трэба вярнуць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

«Першыя вынікі сведчаць, што створана правільная структура»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Стварэнне Саюзнай дзяржавы, Мытнага Саюза, Адзінай эканамічнай прасторы і ў будучыні — Еўразійскага саюза схіляць да аб'яднання і іншыя краіны, выказала ўпэўненасць Валянціна Мацвіенка. Ужо тое аб'яднанне трох краін, якое існуе, гэта — 170 млн чалавек, новы рынак з вялізным патэнцыялам магчымасцяў, адзіныя дакладныя правілы гульні, якія створаны на прынцыпах Сусветнай гандлёвай арганізацыі.

— Але самае галоўнае, нашы першыя вынікі супрацоўніцтва ў рамках Мытнага Саюза і АЭП сведчаць, што мы стварылі правільную структуру, якая выгадна ўсім, — заўважыла Старшыня Савета Федэрацыі. — У леташні першы паслякрызісны год таваразварот Расіі і Беларусі вырас на 38%, мы дасягнулі амаль $40 млрд узаемнага тавараабароту. Такіх тэмпаў росту няма больш ні з адной дзяржавай. Тэндэнцыя працягваецца — сёлета за першы квартал тэмп росту ўзаемнага тавараабароту склаў 29%. Падобныя тэмпы росту і з Казахстанам. У той час з супастаўнай па колькасці насельніцтва і эканоміцы Балгарыяй тавараварот склаў усяго толькі каля $4 млн.

Кіраўнікі верхніх палат парламентаў дзвюх краін патлумачылі, што новае Пагадненне аб супрацоўніцтве, якое яны падпісалі, у большай ступені адпавядае рэаліям сучаснасці. Пасля парламенцкіх выбараў у Беларусі будзе створана сумесная група і складзены спіс канкрэтных сумесных спраў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

АБЗАЦ

◢ Фестываль «Музычныя вечары ў Мірскім замку» пройдзе на тэрыторыі музея «Замкавы комплекс «Мір» 15-17 чэрвеня.

◢ **У Мінску будуць прымаць больш строгія меры да нелегальных таксістаў. Такое даручэнне адказным службам даў старшыня Мінгарвыканкама Мікалай Ладуцька ўчора на аператыўнай нарадзе ў мэрыі. Па звестках падатковых органаў, у Мінску за студзень—май у рамках барацьбы з таксістамі-нелегаламі арыштавана 46 машын, 56 фізічных асоб прыцягнута да адказнасці, накладзена адміністрацыйных штрафаў на суму Br46 млн.**

◢ У Петрыкаве сямігадовы хлопчык забраўся на мясцовую электрычную падстанцыю 110 кВ, дзе быў сур'ёзна траўмаваны токам. Дзіця знайшлі на тэрыторыі падстанцыі 2 чэрвеня. Персанал Петрыкаўскіх раённых электрычных сетак перадаў хлопчыка медыкам. Як мяркуецца, прыкладна ў 14.00 той пералез праз агароджу падстанцыі, залез на адну з ячэек станцыі, дзе дакрануўся галавой да токавядучага кабелю, у выніку яго ўдарыла токам. Дзіця паступіла ў рэанімацыю з апёкам галавы 3-4 ступені, апёкам верхніх і ніжніх канечнасцяў 2-й ступені, чэрапна-мазгавой траўмай. У яго аблалена прыблізна 5% паверхні цела, стан стабільна цяжкі.

◢ **Буйную партыю кантрабандных мабільнікаў затрымалі ў пункце пропуску «Бераставіца» ў Гродзенскай вобласці. Жыхар Ваўкавыска перасякаў мяжу на мікрааўтобусе Volkswagen па «зялёным» канале. Падчас праверкі ў запасным коле выяўлена 218 мабільных тэлефонаў і 300 аксесуараў да іх. Папярэдняя сума ацэнкі нелегальнага грузу склала Br169 млн, іншамаркі — Br50 млн. Тавар канфіскаваны супрацоўнікамі Гродзенскай рэгіянальнай мытні.**

ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ Два расійскія прадпрыемствы, якія займаюцца вытворчасцю прадуктаў харчавання, спрабуюць зарэгістраваць гандлёвую марку «Буранаўскія бабулі». Адно з іх, прадпрыемства з Іжэўска, што выпускае каўбасы, сардэлькі, паўфабрыкаты, кансервы і мяса, падало заяўку на рэгістрацыю таварных знакаў «Буранаўскія бабулі», «Па-буранаўску», «З Буранава». Валодаць такой маркай хочуць і маскоўскія прадпрымальнікі — гандлёвы дом «Неапрадукт». Кампанія займаецца вытворчасцю малочных прадуктаў, у асноўным гэта кісламалочныя прадукты — напрыклад, з цікавымі назвамі «Бодрячок» і «С бодуна». Як заявіла прадзюсар «Буранаўскіх бабуль» Ксенія Рубцова, усе, хто захоча мець падобны брэнд без заключэння адпаведнага дагавора, пойдзе пад суд.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

АРЫШТАВАНЫ БЫЛЫ МЭР ПОЛАЦКА УЛАДЗІМІР ТАЧЫЛА

Арыштаваны былы мэр Полацка Уладзімір Тачыла, паведамілі БЕЛТА ў Следчым камітэце Беларусі.

Уладзімір Тачыла быў змешчаны пад варту 21 мая. «Яму прад'яўлена абвінавачанне ва ўчыненні злачынства, прадугледжанага ч. 3 арт. 424 КК Беларусі (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі). Вядзецца следства.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПАСЛЯ СМЕРЦІ СЯБРОЎ ПАЙШОЎ СПАЦЬ

Светлагорскі раённы аддзел Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь распачаў крымінальную справу па факце смерці двух школьнікаў, якія загінулі ў дарожна-транспартным здарэнні на 6-м кіламетры гравійнай аўтадарогі Міхайлаўка-Красноўка-Малімоны-Коўчыцы.

Як паведамілі ў групе інфармацыі і сувязі з грамадскасцю ўпраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці, у 3 гадзіны ночы 3 чэрвеня на закругленні дарогі 16-гадовы юнак не справіўся з кіраваннем і з'ехаў у кювет, дзе ўрэзаўся ў прыдарожнае дрэва. Як стала вядома, школьнік без дазволу ўзяў ключы ад бацькоўскіх «Жыгулёў», каб пакатаць сяброў. У выніку адзін з пасажыраў (1996 г.н.) загінуў на месцы здарэння, другі (1997 г.н.) памёр у аўтамабілі хуткай дапамогі па дарозе ў бальніцу. 14-гадовая дзяўчына, якая сядзела побач з кіроўцам і была, як і ён, прышпілена рэменем бяспекі, шпіталізаваная ў Светлагорскую ЦРБ са шматлікімі пашкоджаннямі. Сам кіроўца сур'ёзна не пацярпеў.

Акрамя ўсяго, высветлілася, што пасля ДТЗ малады чалавек перапалохаўся і з месца здарэння збег. Толькі ў 6 гадзін раніцы людзі, якія ехалі па дарозе, убачылі вынікі трагедыі і выклікалі хуткую меддапамогу і міліцыю. Цяпер для высвятлення фізічнага стану юнака ў момант здзяйснення ДТЗ узяты біялагічныя аналізы. Светлагорскім раённым аддзелам Следчага камітэта прызначаны шэраг экспертыз, у тым ліку судова-медыцынская і аўтатэхнічная.

Дарэчы, усе юнакі — жыхары вёскі Коўчыцы-1, а дзяўчына жыве ў суседняй Міхайлаўцы. Усе ўдзельнікі ДТЗ — вучні Красноўскай сярэдняй школы Светлагорскага раёна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РЭХА ВАЙНЫ

У Верхнядзвінскім раёне на беразе ракі Дрыса паблізу вёскі Дзярновічы сапёры МУС абясшкодзілі буйны склад боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Выкапалі з зямлі каля трыццаці мінамётных мін. Няцяжка ўявіць, як магло б адгукнуцца «рэха вайны».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Калектыў «Звязды» смуткуе з выпадку смерці аднаго са старэйшых беларускіх журналістаў, былога рэдактара газеты «Вечерний Минск», намесніка рэдактара «Белорусской нивы» Аляксандра Пятровіча ГРЫШАНА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным, блізкім і сябрам.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні генеральнаму дырэктару ТАА «Трайпл» Юрыю Аляксандравічу Чыжу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.

ЗНАК «ЗРОБЛЕНА Ў БЕЛАРУСІ» МАЕ ПАТРЭБУ Ў АБАРОНЕ

ДНЯМІ ў Мінску адбыўся «круглы стол» на тэму: «Як абараніць сябе ад нядобрасумленных канкурэнтаў». Яго правядзенне ініцыявала асацыяцыя абароны і аховы фірменных найменняў і таварных знакаў «БелБрэнд».

Тавары з Беларусі прадаюцца ў розных краінах і на ўсіх кантынентах, але ўдзельнікі размовы абмежаваліся пераважна праблематыкай тэрыторыі Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП). На гэта былі важкія падставы. Так, Беларусь, Казахстан і Расія стварылі Мытны саюз, актыўна вядуць уніфікацыю нацыянальных заканадаўстваў, здымаюць розныя адміністрацыйныя бар'еры на шляху тавараў, працоўнай сілы, капіталаў і г. д. Працэс ідзе. Але нашы прадпрыемствы па-ранейшаму не застрахаваны ад вытворча-гандлёвых непрыемнасцяў і нават трагедый, выкліканых, мякка кажучы, непартнёрскімі паводзінамі асобных партнёраў з АЭП. Адна з такіх сумных гісторый была агучана прадстаўніком аднаго з лідараў па выпуску беларускіх тавараў бытавой хіміі — кампаніі «Бархім» з Баранавічаў.

ЯК У «БАРХІМА» ВЫКРАЛІ ТАВАРНЫ ЗНАК

Давайце паглядзім, як «Бархім» стаў ахвярай уласнай даверлівасці, неразваротлівасці і «нецывілізаваных» паводзін нечаканага, але вельмі нахабнага канкурэнта-прайдзісвета з Казахстана. Праблема ўзнікла, на першы погляд, з нічога, як гаворыцца, літаральна на роўным месцы. Апошнім часам «Бархім» даволі паспяхова працуе ў Казахстане. Там яго прадукцыя карыстаецца ўстойлівым попытам. І ў тых, хто адказвае за знешні гандаль на прадпрыемстве, не выклікаў падазронасці намер аднаго з індывідуальных прадпрымальнікаў Казахстана падключыцца да распаўсюджвання тавараў бытавой хіміі беларускай кампаніі. Быў заключаны адпаведны дагавор, паступіла папярэдняя аплата за пастаўленую прадукцыю. Узята было няшмат — адзін кантэйнер.

На пэўны час прадпрымальніца замаўчала: маўляў, вывучала попыт на новую таварную групу. Справа звычайная, на «Бархіме» цярпліва чакалі адказу бізнэс-вумэн. Ён стаў для кіраўніцтва завода як гром сярод яснага неба. Ліст ад дзелавой жанчыны быў жорсткім і катэгарычным: я на сябе зарэгістравала таварны знак «Бархіма» ва ўсіх яго выявах і праявах, а таму цяпер маю юрыдычнае права гандляваць вырабамі бытавой хіміі з Баранавічаў на тэрыторыі Казахстана. Без майго дазволу вам сюды не будзе доступу. За свае паслугі бізнэс-вумэн прасіла 10 працэнтаў ад кожнай здзелкі. Нагадаем, «Бархім» пастаўляе ў Казахстан прадукцыі прыкладна на мільён долараў ЗША. Значыць, 100 тысяч долараў трэба будзе «адшпіліць»... Кіраўніцтва прадпрыемства забіла трывогу — звярнуліся з пісьмамі ва ўрад Казахстана, у пасольствы (казахстанскае ў Мінску і беларускае ў Астане). Дарма. Дапамогі аніякай. Праўда, параілі звяртацца ў суд. Цяпер «Бархім» рознымі шляхамі, у тым ліку і з дапамогай асацыяцыі «БелБрэнд», змагаецца за сваё законнае права гандляваць у Казахстане.

Старшыня асацыяцыі «БелБрэнд» Альберт Таіпаў лаканічна рэзюмаваў наступствы гэтай «падставы»: у «Бархіма» выкралі яго таварны знак і цяпер не пускаюць у Казахстан. Вось вынік марудлівасці беларускага прадпрыемства па рэгістрацыі свайго таварнага знака ў іншай краіне. На погляд экспертаў «круглага стала», якія горача абмяркоўвалі сітуацыю з «Бархімам», увогуле недаравальна было цэлы год пастаўляць у Казахстан прадукцыю без прыняцця адпаведных мер для захавання сваіх інтарэсаў і пазіцый на яго рынку. Зараз, са спазненнем, «Бархім» ва ўсіх краінах, дзе на рынках прадстаўлена яго прадукцыя, праводзіць рэгістрацыю свайго таварнага знака.

ЛЕПШ ВУЧЫЦЦА НА ЧУЖЫХ ПАМЫЛКАХ

Ісціна старая, як свет, зразумелая кожнаму, але чамусьці многія нашы вытворцы працягваюць вучыцца менавіта на сваіх памылках. Гэта і «Бархім», і шэраг іншых беларускіх прадпрыемстваў. Таму да ўсіх нашых экспарцёраў у час «круглага стала» неаднойчы гучаў заклік не чакаць, пакуль смажаны певень клюне ў адно месца, а потым пісаць скаргі ў розныя інстанцыі, заводзіць судовыя справы. У час размовы разгарнулася вострая дыскусія аб тым, як абараніць беларускага вытворцу ад нядобрасумленных канкурэнтаў. Яе актуальнасць была асабліва відавочная ў святле паводзін украінскага вытворцы цукерак «Рашэн» на кандытарскім рынку Беларусі ў дачыненні да прадукцыі гомельскай фабрыкі «Спартак».

Невыпадкова намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Дзяніс Нядвецкі звярнуў увагу на тое, што рэгістрацыя на сябе чужога таварнага знака — не такая ўжо і рэдкая з'ява на постсавецкай прасторы. Прывёў такі прыклад. Усе дачнікі выдатна ведаюць такі карысны для агарода айчынны выраб, як насос «Ручеек». Яго 15 гадоў выпускае беларускае прадпрыемства. Калі нарэшце вырашылі гэты тавар зарэгістраваць у Расіі, то аказалася, што яго таварны знак ужо ўцэлую зарэгістраваны паўгода таму нядобрасумленнымі канкурэнтамі. Вось аргументы вытворцаў: маўляў, мы 15 гадоў выпускаем гэты насос і заявы аб тым, што «нас усюды добра ведаюць па гэтым вырабе», пакуль не прымаюцца адпаведнымі органамі як пераканаўчыя.

Грашаць незаконным прысваенне чужых таварных знакаў не толькі ў Расіі, Казахстане, ва Украіне але, на жаль, і ў Беларусі. Ёсць такія выпадкі. Замежныя вытворцы часам скардзяцца на рэгістрацыю іх таварных знакаў нашымі суайчыннікамі. Як правіла, гэтыя праблемы вырашаюцца ва ўстаноўленым законам парадку, пераважна праз суд з дапамогай беларускіх так званых патэнтных павераных, у якіх ёсць досвед вырашэння падобных спрэчных спраў. Таму і пацярпелым за мяжой ад нядобрасумленных канкурэнтаў беларусам як у нашым выпадку ў блізкім замежжы лепш за ўсё звяртацца да расійскіх, казахскіх, украінскіх і г.д. патэнтных павераных, а не пісаць слёзныя пісьмы ва ўладныя структуры. Але нашы прадпрыемствы любяць эканоміць, а таму разлічваюць выключна на сваіх юрыстаў. Гэта тыповая грубая памылка. Бо далёка не кожны заводскі юрыст, які складае і правярае дагаворы аб пастаўках прадукцыі, з'яўляецца кваліфікаваным спецыялістам у сферы інтэлектуальнай уласнасці. А калі размова ідзе аб верагодных стратах на мільёны долараў, то не варта эканоміць некалькі тысяч долараў на паслугах патэнтных павераных, якія выдатна ведаюць заканадаўства той ці іншай краіны па вышэйназваным пытанні. Потым даражэй будзе. Метад проб і памылак — дарагі, марудны і непрадуктыўны, упэўнены Дзяніс Нядвецкі.

ЧАМУ БЕЛАРУСКАЕ АБАВЯЗКОВА ТАННАЕ?

Гэта сустрэча прадстаўнікоў дзелавых колаў, бізнэс-супольнасці, дзяржаўных структур, прадпрыемстваўладальнікаў падкрэсліла, што ў нашай краіне ёсць усе неабходныя ўмовы для развіцця эканомікі ведаў. Ёсць моцная навукова-тэхнічная база, высокакваліфікаваныя кадры, якія могуць ствараць канкурэнтаздольную прадукцыю. Але ў нас, на жаль, вельмі слабая інфраструктура, якая б дапамагала нашым вытворцам прасоўваць свае тавары на знешнія рынкі. Не хапае і эфектыўнай сістэмы падрыхтоўкі экспарцёраў. Ды і ў самой краіне не ўсе ўмовы створаны для таго, каб беларускія тавары былі канкурэнтаздольнымі. Напрыклад, высокія падаткі, якія ўскосна ўплываюць на кошт прадукцыі, не спрыяюць развіццю прадпрымальніцтва. Ды і ў самой дзяржаве, як адзначылі ўдзельнікі размовы,

ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ БЕЛАРУСКАГА ДОМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напрыклад, у яго гістарычным цэнтры, побач з ужо традыцыйнымі для фестывалю нацыянальнымі падворкамі, размешчана сінагога, дзе цяпер ідзе рэстаўрацыя будынка, а таксама ствараецца музейная экспазіцыя яўрэйскай гісторыі і культуры Гродна. Не проста як памяць пра вядомых асоб-яўрэяў, а ў кантэксце ўсяго шматнацыянальнага краю: у гонар тых жа сялян Пухальскіх з беларускай вёскі Ласосна, якія ў гады халакосту выратавалі яўрэйскага хлопчыка Фелікса Зандмана (потым славутага фізіка-электроншчыка, доктара філасофіі) і яшчэ чатырох яўрэяў.

Арганізатар музея Беніямін Ерузалім — гродзенскі старажыл, тутэйшы. А вось кім лічыць, напрыклад, Уладзіміра Шуглю? Не паварочваецца язык назваць госцем Ганаровага консула Беларусі ў Цюмені — эканаміста, палітолага, а таксама аўтара паэтычных зборнікаў, адзін з якіх перакладзены на беларускую мову.

— У Карэлічах я спецыяльна шукаў, адкуль мае карані, і знайшоў іх, па бацьку, з 1680 года, — расказвае Уладзімір Фёдаравіч. — Убачыў там больш за 30 помнікаў з маім прозвішчам. Пазнаёміўся і са сваім, пэўна, дзевяціюрадным братам Віктарам Фёдаравічам Шуглем — цяпер мы сябруем. Калі ты займаешся радаводам, то становішся на гэтай зямлі мацнейшым.

Уладзімір Шугля ўзначальвае Цюменскую абласную грамадскую арганізацыю «Саюз — інтэграцыя брацкіх народаў»:

— У гэтую арганізацыю аб'ядналіся тыя, хто любіць Беларусь. Менавіта таму я і выконваю абавязкі Ганаровага консула Беларусі ў Цюмені. Імкнуся задзейнічаць усе свае сувязі, кантакты ў Заходняй Сібіры, каб дапамагчы беларусам у прасоўванні тавараў, рэалізацыі эканамічных праектаў. Толькі за апошні год у Цюмені арганізавалі беларуска-расійскае СП па ліфтавым абсталяванні, прадалі 500 трактароў «МТЗ» і 41 аўтобус «МАЗ» (неўзабаве атрымаем яшчэ 50), а таксама стварылі сэрвісныя цэнтры па абслугоўванні гэтай тэхнікі. Цяпер працуем над адкрыццём філіяла МАЗа на базе аднаго з машынабудаўнічых прадпрыемстваў. Акрамя таго, у паўднёвай зоне Цюмені сабрана 50 камбайнаў «Палессе» і, мяркую, гэтым не абмяжуецца.

На фестываль у Гродна Уладзімір Шугля прыехаў разам з народным ансамблем беларускай песні «Лянок» (кіраўнік Клаўдзія Зуева). Зрэшты, падчас знаходжання ў горадзе над Нёманам ён не толькі прысутнічаў на святочных імпрэзах, але і выконваў свае дыпламатычныя абавязкі. Падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы і Цюменскім архітэктурна-будаўнічым універсітэтам. У прыватнасці, ёсць сумеснае жаданне, каб студэнцкі атрад з Гродна папрацаваў у Цюмені.

Уладзімір Шугля лічыць, што фестываль нацыянальных культур у Беларусі з'яўляецца яскравым прыкладам «народнай дыпламатыі» і мае вялізнае значэнне ва ўмацаванні ўзаемнай павагі паміж людзьмі, сяброўства, супрацоўніцтва. Такой думкі прытрымліваецца і Альфонсас Аўгуліс (дарэчы, першы пасол Літвы ў Беларусі ў 1993-1994 гадах). Родам ён з Гродзеншчыны, з Астравецкага раёна, дзе жыве шмат літоўцаў. Яго маці — беларуска, бацька — літовец.

— У Вільнюсе цяпер жывяце? — пытаюся.

— Напалову. Ёсць дом і на Астравеччыне — там шмат сваякоў і сяброў.

— А ці часта там бываеце?

— Сканчаюцца малако ці саланіна — еду на Астравеччыну, — усміхаецца Альфонсас Аўгуліс.

Спадар Аўгуліс з'яўляецца старшынёй міжнароднай грамадскай арганізацыі «Клуб «Гервячай», у якую ўваходзяць ураджэнцы Астравеччыны: і сённяшнія яе жыхары, і тыя, хто жыве ў замежжы (Расія, Польшча, Латвія, Літва, Канада і іншыя краіны).

— Мы — як свае: кантактуем паміж сабой, стараемся дапамагчы адзін аднаму. Калі ты з гэтага краю выхадзец, то павінен дапамагаць сваёй малой радзіме, спрыяць добрым адносінам паміж нашымі краінамі, народамі. Усім хачу сказаць: «Любіце сваю малую радзіму і ведайце, што нічога няма вышэй за яе. Ёсць мама, тата і мясціны, дзе ты нарадзіўся. Дзе той лясок, той пясочак. Дзе ты, прыязджаючы, заўсёды з'яўляешся сваім, — зазначае Альфонсас Аўгуліс.

Менавіта пашанай да сваіх каранёў, традыцый заўсёды вызначаюцца фестывальныя нацыянальныя падворкі. Прычым там заўсёды ёсць нейкая «фішка». Раней паказвалі, напрыклад, вясельныя абрады, а на гэты раз — веснавыя абрады і святы народаў Беларусі. Адзін з іх, на польскім падворку, паказала фальклорна-абрадавая група з пасёлка Сапоцкін (Гродзенскі раён).

— Некалі дзяўчаты збіраліся на другі дзень Вялікадня і аж да Сёмухі хадзілі па хатах з упрыгожаным дрэўцам, сасёнкай ці бярозкай. Віншавалі са святам, жадалі здароўя, каб быў плён у гаспадарцы. Тыя ж валачобнікі, але без хлопцаў, — расказвае кіраўнік калектыву Леанарда Шукець.

Важнай падзеяй у рамках фестывалю стала пасяджэнне кансультатыўнай рады па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве культуры Беларусі, у якім разам з кіраўнікамі беларускіх аб'яднанняў з Расіі, Польшчы, Літвы, Латвіі, Украіны і іншых краін удзельнічалі намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль Тозік, міністр культуры Павел Латушка, прадстаўнікі Міністэрства адукацыі, апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў і іншых зацікаўленых арганізацый. Падкрэслівалася, што нельга развіваць нашу нацыянальную культуру, не ўлічваючы ўклад у яе беларускай дыяспары. Увага Міністэрства культуры і іншых дзяржаўных устаноў цяпер сканцэнтравана на распрацоўцы адпаведных нарматыўных актаў, якія рэгламентуюць пытанні супрацоўніцтва з беларускім замежжам. У бліжэйшы час ва ўрад будзе ўнесены праект дзяржаўнай праграмы «Беларусы ў свеце» на 2012—2015 гады, дзе прадугледжана падтрымка беларусаў замежжа ў захаванні іх нацыянальна-культурнай аўтэнтычнасці, развіцці беларускамоўнай адукацыі. Садзейнічаць гэтаму будуць, у прыватнасці, культурныя цэнтры Беларусі за мяжой, першы з якіх ужо дзейнічае ў Польшчы. У наступным годзе такі цэнтр мяркуецца адкрыць у Маскве, а затым у Літве, ва Украіне, Германіі. Пры гэтым, адзначалася на пасяджэнні кансультатыўнай рады, прыярытэтам і для аб'яднанняў дыяспары, і для дзяржаўных, грамадскіх арганізацый Беларусі павінна быць праца з этнічнай беларускай моладдзю за мяжой. Менавіта ад таго, як будзе арганізавана такая праца, у тым ліку па падтрымцы існуючых і адкрыцці новых устаноў па вывучэнні беларускай мовы, стварэнні моладзевых аб'яднанняў у замежжы, залежыць жыццездольнасць беларускай дыяспары.

На пасяджэнні кансультатыўнай рады абмеркавалі ход падрыхтоўкі да другога фестывалю мастацтваў беларусаў свету, а таксама падтрымалі прапанову аб правядзенні эканамічнага форуму з удзелам беларусаў замежжа, сярод якіх шмат паспяховых бізнэсменаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА і БЕЛТА.

Наша даведка

Першы фестываль нацыянальных культур, які адбыўся ў Гродне ў 1996 годзе, сабраў прадстаўнікоў 11 грамадскіх аб'яднанняў. А ў IX фестывалі пажадалі ўдзельнічаць прадстаўнікі ўжо 33 нацыянальнасцяў, якія жывуць у нашай краіне. Упершыню да фестывальнага руху далучыліся выхадцы з Венесуэлы, Іспаніі, Ірана, Нігерыі. Увогуле ў Беларусі на сённяшні дзень зарэгістравана больш за 180 грамадскіх аб'яднанняў 26 нацыянальных суполак.

КРЫТЫЧНА НІЗКАЯ ВАГА — НЕ ПРЫСУД

У Гродне завершана рэканструкцыя абласнога перынатальнага цэнтра

Сімвалічна, што ўрачыстасці з нагоды заканчэння маштабнай рэканструкцыі галоўнай рододапаможнай установы Гродзеншчыны былі прымеркаваны да Дня абароны дзяцей. Адзін з прыярытэтных аб'ектаў абласной інвестыцыйнай праграмы мадэрнізаваны згодна з сучаснымі еўрапейскімі стандартамі і першым з лячэбных устаноў рэспублікі атрымаў сертыфікат адпаведнасці сістэмы менеджменту якасці патрабаванням СТБ ISO 9001-2009. Гэта важна не толькі для жыхароў Прынёманскага краю, але паспрыяе і экспарту медыцынскіх паслуг перынатальнага цэнтра.

Зрэшты, нельга супакойвацца на дасягнутым. Мадэрнізацыю, укараненне перадавых медыцынскіх тэхналогій трэба праводзіць пастаянна, чаго і пажадаў калектыву перынатальнага цэнтра **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА**.

Паводле інфармацыі **галоўнага ўрача медустановы Віктара ЛІСКОВІЧА,** перынатальны цэнтр цяпер аснашчаны самым сучасным дыхальным абсталяваннем, інкубатарамі для выходжвання неданошаных дзяцей, маніторамі назірання, трохмерным апаратам УГД, камп'ютарамі. Дзякуючы сучаснаму абсталяванню, новым тэхналогіям і, вядома ж, прафесіяналізму медыцынскага персаналу, летась тут выхадзілі 57 дзяцей вагой менш за паўтара кілаграма. А нядаўна — дзяўчынку, якая пры нараджэнні важыла... 480 грамаў. Па крытэрыях Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, плод з такой экстрэмальна нізкай масай цела лічыцца нежыццяздольным, аднак правільныя дзеянні медыкаў з першых хвілін пасля нараджэння дазволілі стабілізаваць стан глыбока неданошанага дзіцяці.

Дарэчы, на вуліцу Горкага радзільня пераехала роўна 50 гадоў таму. За паўстагоддзя тут з'явілася на свет каля 200 тысяч малых.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

МАЙСКІЯ ЗАМАРАЗКІ НЕ ПАШКОДЗІЛІ ПАСЕВЫ СЕЛЬГАСКУЛЬТУР

Аб гэтым паведаміў учора журналістам, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў.

«Цяперашні май быў даволі цёплым, такі ён бывае прыкладна раз у 5 гадоў», — сказаў Дзмітрый Рабаў. Было два халодныя перыяды — у сярэдзіне месяца і ў канцы. Адзначаліся замаразкі да нуля — мінус чатырох градусаў, на станцыі «Палеская» — да мінус сямі градусаў. Кожны май — пачатак чэрвеня па рэспубліцы бываюць замаразкі, нічога анамальнага ў гэтым няма, падкрэсліў начальнік службы. Аграметэаролагі даюць рэкамендацыі па доглядзе пасеваў у гэты няпросты перыяд.

«У гэтым годзе складваюцца вельмі спрыяльныя ўмовы для росту сельгаскультур, асабліва азімых», — сказаў Дзмітрый Рабаў. Ёсць цяпло і вільгаць, неабходныя для раслін, таму пакуль ёсць усе шансы сабраць добры ўраджай. У цэлым да замаразкаў найбольш успрымальныя ў Беларусі азімыя, кукуруза, яблыні і вішні.

Кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 10 (721) адрэса рэдакцыі 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дача ў в. Чарняты Мядзельскага раёна, возера 100 м.
Тэл. 80215551233, МТС 7772309.

❒ 3-пакаёвая кааператыўная кватэра з гаражом у р.ц. Гарадок (2-гі паверх, 65 кв.м), танна, растэрміноўка, або мяняю на любое жыллё ў Мінску, прыгарадзе.
Тэл. 80292900710.

❒ Дом 65.6 кв.м, в. Занарач Мядзельскага р-на, побач лес, воз. Нарач, 25 сотак.
Тэл. 80177144356.

❒ А/м «Форд-Сьера», 2,3, 1992 г., ТА і СТ, белы. Цана дагаворная.
Тэл. МТС 2730414.

❒ Козлік (2 мес.), мяса трусоў.
Тэл. 80297660985.

❒ Касілка КС-21, граблі ГВР-3, даільны апарат.
Тэл. 80293605255.

❒ Шлюбная сукенка, грэчаскі стыль, 42—46 пам., колер шампань, рост 165—170 і пальчаткі новыя, падушка для пярсцёнкаў, мяшок для грошай, футра ў падарунак. Вераніка.
Тэл. 80298724810.

❒ Касілка 2-ротарная новая (Польшча).
Тэл. 80292920614.

❒ Кабыла ўласнай гадоўлі, 4-гадовая, прыгожай масці.
Тэл. 80164552226.

КУПЛЮ

❒ Плуг 2-корпусны да Т-25.
Тэл. 80177242591.

❒ Хату ў маляўнічым месцы недалёка ад Мінска.
Тэл. 80299080298.

ЗВЯЗДА **КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ЧАС САПРАЎДНЫХ РЫЦАРАЎ

У Полацку ў межах святкавання 1150-гадавіны з Дня заснавання горада адбыўся міжнародны і па-свойму ўнікальны фестываль сярэднявечнай культуры «Рубон». У ім бралі ўдзел прадстаўнікі клубаў гістарычнай рэканструкцыі з Беларусі, Расіі, Літвы, Чэхіі і Польшчы... Многія з іх прыехалі ў старажытны Полацк з жонкамі і дзецьмі.

Цікава, што Рубон — гэта назва ракі Заходняя Дзвіна ў старадаўнія часы. А яшчэ слова «рубон» — старажытны баявы кліч полацкіх воінаў, з якім яны ішлі ў атаку. Фэст сярэднявечнай культуры праводзіўся пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза ў межах адпаведнага праекта, які спрыяе развіццю турыстычнага патэнцыялу ў трансгранічным рэгіёне.

Рыцары размясцілі свой лагер у парку каля Кургана Бессмяротнасці, што сімвалізавала неўміручасць подзвігу ўсіх, хто абараняў сваю зямлю ў розныя часы. Між іншым, раней гэтая «пляцоўка» была востравам, дзе, па меркаваннях некаторых даследчыкаў гісторыі і краязнаўцаў, знаходзіўся манастыр Іаана Прадцечы.

Гледачы дзейства, якое расцягнулася аж на тры дні, «перанесліся ў часе» ў IX—XV стагоддзі. Адкрыўся «Рубон» у першы дзень чэрвеня ўвечары канцэртам старадаўняй музыкі. Відовішчнымі атрымаліся рыцарскія спаборніцтвы — турніры лучнікаў, рыцараў ранняга і позняга сярэднявечча, і так званыя бугурты — камандныя бітвы воінаў у даспехах вагой не менш за пуд. (Адзін толькі меч важыць каля 1,2 кілаграма.)

Госці фэсту на свае вочы пабачылі сярэднявечны побыт у шатровым лагеры, пакаштавалі прысмакі старадаўняй кухні. Дзіўна, але рэцэпты некаторых страў не змяніліся і да нашых дзён. Для юных гледачоў была арганізавана спецыяльная дзіцячая пляцоўка з сярэднявечнымі гульнямі і выступленнямі батлейкі. Дзятва ў тым ліку змагла нават пагуляць з старадаўнімі драўлянымі цацкамі.

— З задавальненнем удзельнічаю ў гэтым фестывалі, — расказвае беларус Іван Гарблянскі. — У лагеры тры дні жывеш ва ўмовах іншай гістарычнай эпохі: посуд, драўляныя лыжкі, відэльцы, ежа, стравы — усё такое, як у часы сярэднявечча.

— Я ўпершыню ўбачыў такое маштабнае свята, — гаворыць Віргіліус Мілакніс, саветнік мэра літоўскага горада Анікшчай. — Вельмі добра, што людзі настолькі захоплены гісторыяй, што прадстаўнікі клубаў гістарычнай рэканструкцыі з розных краін паказваюць нам, як жылі нашы продкі.

Другі дзень фестывалю скончыўся начным тэатралізаваным штурмам замка з выкарыстаннем абарончых абозаў, агню і конніцы. А ў нядзелю, 3-га чэрвеня, адбылося закрыццё фэсту і ўзнагароджанне пераможцаў турніру на галоўнай сцэне свята. Арганізатары паабяцалі, што «Рубон» стане яшчэ больш маштабным і насычаным падзеямі «рыцарскім турнірам».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Полацк — Віцебск.

ЕЎРА-2012: ФУТБОЛ, ПАЛІТЫКА І ПІВА

Усё. Украінскія «вбулевальнікі» і польскія «кібіцы» нарэшце могуць выдыхнуць з палёгкай, узяць з халадзільніка бутэльку піва і ўключыць сваю тэлескрыню з гукам на максімум. І няхай старая Алеся ці Агнэшка апантана б'е ў батарэі. Будзе марна. Заўтра дзень, калі заўзятарам можна будзе дараваць амаль усё. У Варшаве распачынаецца 14-ы чэмпіянат Еўропы па футболе.

Я заўжды любіў Еўра. Што казаць, маё дзяцінства можна вымяраць не асобнымі гадамі, а перыядамі паміж кантынентальнымі чэмпіянатамі. Яны нібы прыватны архіў, што захоўваецца ў маёй свядомасці, куды ў любы момант можна звярнуцца па інфармацыю, якая ніколі не знікне з памяці. У 96-м, напярэдадні чэмпіянату Еўропы ў Англіі дзякуючы дзеду Эдзіку, які падарыў мне альбом з налепкамі, я ўпершыню даведаўся пра фенаменальных харватаў у «шашачнай» форме (Алена Бокшыча, Давара Шукера і барадача Званіміра Бобана), убачыў «карпацкага Марадону» (румына Георге Хаджы) і «аранжавага» галандца Патрыка Клюйверта. У 2000-м назіраў на бабулінай кватэры са сціснутымі кулакамі за феерыяй французаў, якія ў фінале паказалі дулю італьянцам. 2004-ы нарадзіў футбольны феномен Грэцыі, а 2008 — гэта дзіўная зборная Расіі і Галандыя, якую «братушкі» перамаглі з суправаджэннем радаснага каментатара Георгія Чарданцава. Беларусы радаваліся за рускіх, пілі за здароўе Гуса Хіддзінка, я шчыра тапіў у бакале крыўду за ўлюбёных галандцаў, а дзесьці пад Новасібірскам нарадзіўся хлопчык, запісаны ў метрыцы Гусам Яўгенавічам. Так-так, суровых сібірскіх мужыкоў таксама часам цягне на лірыку...

Чарговы чэмпіянат Еўропы Украіны і Польшчы — стапрацэнтны атракцыён на трываласць. Столькі плётак, скандалаў, «вутак» пра перанос, байкот першынства я не чуў ніколі ад свайго нараджэння. Калі яшчэ застаўся нехта, хто лічыць, што быццам спорт па-за палітыкай, то месца яму сярод утапістаў-аптымістаў. Палітыка ўкараняецца дзесьці на падсвядомым узроўні і ў пэўны момант эгаістычна нагадвае пра мінулыя крыўды. Прыгожа казаць можна пра што заўгодна, але наўрад ці артадокс-серб будзе шчыра ціснуць руку касавару. Гэта рэчаіснасць, жыццё, якое расстаўляе прыярытэты часам так, што дзядуля Кубертэн, на жаль, са сваёй этыкай курыць убаку. Я не спецыяліст па гісторыі Украіны, але ўпэўнены: адбіраць Еўра ў тых, каму самі яго калісьці падарылі, як любімую цацку ў дзіцяці, негуманна, не па-даросламу, нелагічна. Асабліва ў тым выпадку, калі ад адмовы адным, пакутаваць будуць і іншыя. Але дзякуй. Усё абышлося.

Чарговы чэмпіянат Еўропы — водар Балтыкі на вуснах і шахцёрскі пейзаж Данбаса. Так, гэта той выпадак, калі геаграфію можна вывучаць па футболе і стадыёнах, дзяржаўных гімнах і нацыянальных сцягах.

У чарговы раз на футбольным «Еўрабачанні» не знайшлося месца беларусам. І гэта ўжо той выпадак, калі крыўдзіцца можна толькі на сябе. Аднак памятаеце, што ў такім выпадку любіў паўтараць Бернд Штанге, экс-трэнер нашай зборнай? Не, не нервоваў ў стылі «ва ўсім вінаваты зладзеі-балканцы». Чалавек ён хоць «гэдээраўскага» гарту, але пазітыўны, таму не плакаў, а казаў: «Аптымізмус!». Карацей, вось ён рэцэпт, з якім будзе і хлеб, і ежа. А колькі з усяго гэтага будзе, праверым праз чатыры гады.

А яшчэ Еўра — гэта шмат размаляваных у вясёлкавыя колеры фанатаў, шмат драйву, прыгожых дзяўчат і горы пустых піўных бляшанак. Але галоўнае — цудоўны, эстэтычны футбол. Яго будзе так шмат, што хопіць на год наперад. Таму рыхтуйцеся, уладкоўвайцеся ў крэслах, чакайце, кажыце каханым, што футбол — гэта і тэатр, і кіно, без якога жыццё што зямля без сонца — нішто. І будзе тады вам футбольнае шчасце. Абяцаю.

Тарас ШЧЫРЫ.

ДА ЎВАГІ

У групавым раўндзе 16 зборных падзялілі на 4 групы. З кожнага квартэта ў чвэрцьфінале выйдуць па дзве лепшыя каманды. Група «А»: Польшча, Расія, Грэцыя, Чэхія.

Група «В»: Галандыя, Германія, Партугалія, Данія.
Група «С»: Іспанія, Італія, Харватыя, Ірландыя.
Група «D»: Украіна, Англія, Швецыя, Францыя.

8-га чэрвеня
Група А -19:00 Польшча — Грэцыя (Варшава)
Група А — 21:45 Расія — Чэхія (Уроцлаў)

9-га чэрвеня, субота
Група В — 19:00 Галандыя — Данія (Харкаў)
Група В — 21:45 Германія — Партугалія (Львоў)
10-га чэрвеня, нядзеля
Группа С — 19:00 Іспанія — Італія (Гданьск)
Группа С — 21:45 Ірландыя — Харватыя (Познань)

11-га чэрвеня, панядзелак
Група D — 19:00 Францыя — Англія (Данецк)
Група D — 21:45 Украіна — Швецыя (Кіеў)

12-га чэрвеня, аўторак
Група А — 19:00 Грэцыя — Чэхія (Уроцлаў)
Група А — 21:45 Польшча — Расія (Варшава)

13-га чэрвеня, серада
Група В — 19:00 Данія — Партугалія (Львоў)
Група В — 21:45 Галандыя — Германія (Харкаў)

14-га чэрвеня, чацвер
Група С — 19:00 Італія — Харватыя (Познань)
Група С — 21:45 Іспанія — Ірландыя (Гданьск)

15-га чэрвеня, пятніца
Група D — 19:00 Швецыя — Англія (Кіеў)
Група D — 21:45 Украіна — Францыя (Данецк)

16-га чэрвеня, субота
Група А — 21:45 Грэцыя — Расія (Варшава)
Група А — 21:45 Чэхія — Польшча (Уроцлаў)

17-га чэрвеня, нядзеля
Група В — 21:45 Партугалія — Галандыя (Харкаў)
Група В — 21:45 Данія — Германія (Львоў)

18-га чэрвеня, панядзелак
Група С — 21:45 Харватыя — Іспанія (Гданьск)
Група С — 21:45 Італія — Ірландыя (Познань)

19-га чэрвеня, аўторак
Група D — 21:45 Швецыя — Францыя (Кіеў)
Група D — 21: 45 Англія — Украіна (Данецк)

БЕЛАГРА-2012

Паважаныя ўдзельнікі і госці «Беларускага аграпрамысловага тыдня»!

Ад імя Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь вітаю вас і віншую з адкрыццём 22-й Міжнароднай спецыялізаванай выставы «Белагра-2012».

Гэты форум, які не мае аналагаў па маштабнасці ў рэспубліцы, па праве лічыцца адной з ключавых падзей года для прадстаўнікоў аграпрамысловага комплексу, перапрацоўчай прамысловасці і сумежных галін. Ён не толькі дэманструе нашы дасягненні ў раслінаводстве, жывёлагадоўлі, харчовай прамысловасці, аграрнай навуцы, сельскагаспадарчым машынабудаванні, але і абагульняе міжнародны вопыт у гэтых сферах, стымулюе пошук новых тэхналогій і інавацыйных рашэнняў.

«Беларускі аграпрамысловы тыдзень» заслужана карыстаецца вялікай увагай нашых замежных партнёраў: у мінулым годзе яе наведалі прадстаўнікі аграрных ведамстваў больш як 30 краін і рэгіёнаў блізкага і далёкага замежжа, у тым ліку кіраўнікі аграпрамысловых ведамстваў Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Украіны, Расійскай Федэрацыі. Упэўнены, што і ў гэтым годзе яна прыцягне не менш гасцей.

З года ў год павышаецца ўзровень экспазіцый «Белагра» і пашыраецца кола яе ўдзельнікаў, у тым ліку замежных. Сёлета імі стануць кампаніі з 17 краін: Беларусі, Аўстрыі, Балгарыі, Германіі, Італіі, Ірана, Кітая, Карэі, Латвіі, Літвы, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, Украіны, Францыі, Чэхіі і Швейцарыі.

У рамках Беларускага аграпрамысловага тыдня будзе прадстаўлены шырокі спектр сучаснай сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання для аграпрамысловага комплексу, новыя распрацоўкі аграрнай навукі, племянныя жывёлы, насенне і расліны, агрохімія, сродкі абароны раслін і глеб і многае іншае, неабходнае для эфектыўнай сельскагаспадарчай вытворчасці.

Прафесійным суправаджэннем выставы «Белагра-2012» стане дзелавая праграма, насычаная мерапрыемствамі па розных кірунках развіцця аграпрамысловага сектара.

Спадзяюся, што выстава дасць магчымасць не толькі азнаёміцца з найноўшымі дасягненнямі айчыннай і сусветнай навукі і практыкі ў вытворчасці, перапрацоўцы, гандлі і захоўванні сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання, але і закладзе добрую базу для заключэння ўзаемавыгадных гандлёвых кантрактаў, абмену навукова-вытворчым вопытам, умацавання супрацоўніцтва на міжнародным узроўні.

Жадаю ўсім удзельнікам і гасцям форуму плённай працы!

Выканаўца абавязкаў міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Л. МАРЫНІЧ

АЙДА НА ВЫСТАВУ!

З 5 па 10 чэрвеня ў Беларусі пройдзе 22-я Міжнародная выстава «Белагра-2012»

Экспазіцыі гэтай буйнейшай у нашай краіне сельскагаспадарчай выставы, па традыцыі, размесяцца на дзвюх пляцоўках. **З 5 па 8 чэрвеня — у сталічным Футбольным манежы (пр-т Пераможцаў, 20/2), з 6 па 10 чэрвеня — на дэманстрацыйным полі ў ААТ «Гастэлаўскае», што пад Мінскам.**

Удзел у выставе, паводле слоў **памочніка генеральнага дырэктара ЗАТ «МінскЭкспа» Святланы ЗВЕЗДЗІНАЙ,** прымуць 300 кампаній з 18 краін свету: Беларусі, Аўстрыі, Бельгіі, Германіі, Іспаніі, Ірана, Кітая, Карэі, Латвіі, Літвы, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, ЗША, Украіны, Францыі, Чэхіі і Швейцарыі. Замежныя спецыялісты ў вобласці сельскай гаспадаркі прадставяць на суд айчыннага пакупніка інавацыйныя праекты ў вобласці сельгастэхналогій і абсталявання. Аднак, па традыцыі, каля 70 % усіх экспазіцый зоймуць беларускія ўдзельнікі. Сярод іх вядучыя навуковыя цэнтры Акадэміі навук, перапрацоўшчыкі, вытворцы сельгастэхнікі.

Варта адзначыць, што на тэрыторыі ААТ «Гастэлаўскае» — асноўнай пляцоўцы выставы — можна будзе не толькі пазнаёміцца з навінкамі тэхнікі, але і ўбачыць яе ў працы на полі. Таксама там пад адкрытым небам будуць прадстаўлены дасягненні сучаснай селекцыі сельскагаспадарчых культур, племянной жывёлагадоўлі і птушкагадоўлі, племянной і спартыўнай конегадоўлі і г. д.

«Белагра-2012» — гэта ўнікальная магчымасць не толькі даведацца пра новыя тэндэнцыі ў развіцці аграрнай галіны, абмяняцца вопытам, дастойна прадставіць сваю прадукцыю, паказаць апошнія навінкі, але і наладзіць камерцыйныя, навуковыя і адукацыйныя кантакты. Зрабіць гэта можна будзе ў тым ліку і падчас тэматычных канферэнцый, семінараў, дзелавых сустрэч, якія з'яўляюцца гарманічным дапаўненнем выставы.

Шмат прыемных сюрпрызаў падрыхтавалі арганізатары — Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства прамысловасці і ЗАТ «МінскЭкспа» — не толькі для ўдзельнікаў-прафесіяналаў, але і для простых наведнікаў. На працягу работы выставы пройдуць выступленні творчых калектываў, дэманстрацыі, прэзентацыі, паказальныя выступленні конных спартсменаў, дэгустацыі... Як у Футбольным манежы, так і ў гандлёвым гарадку на дэманстрацыйным полі наведнікі змогуць не толькі пакаштаваць, але і набыць лепшыя ўзоры айчыннай харчовай прадукцыі: мясныя, макаронныя і хлебабулачныя вырабы, вытанчаныя далікатэсы з птушкі, кансерваваныя прадукты, марозіва, гародніну і садавіну, дзіцячае і дыетычнае харчаванне і многае іншае.

Святочныя мерапрыемствы, абяцаюць арганізатары, не пакінуць абыякавым нават самага патрабавальнага наведніка. Час работы выставы: **Футбольны манеж (5 чэрвеня — з 14.00 да 18.00, 6 і 7 чэрвеня — з 10.00 да 18.00, 8 чэрвеня — з 10.00 да 15.00), дэманстрацыйнае поле ў ААТ «Гастэлаўскае» (6 чэрвеня — з 12.00 да 18.00, 7-9 чэрвеня з 10.00 да 18.00, 10 чэрвеня — з 10.00 да 15.00).**

Падрабязней пра тое, чым «Белагра-2012» «зачапіла» карэспандэнтаў «Звязды» і іншых наведнікаў, чытайце ў адным з бліжэйшых нумароў.

Надзея ДРЫЛА.

КОЖНЫ ДЗЯСЯТЫ Ў СВЕЦЕ — «БЕЛАРУС»!

І гэта не дэмаграфічны выбух, а вынікі паспяховай дзейнасці ВА «Мінскі трактарны завод»

ТОЕ, што тэхніку «Беларус» і само прадпрыемства МТЗ на радзіме ведае амаль кожны, за выключэннем, магчыма, самых маленькіх жыхароў нашай краіны — сумненняў няма.
І не дзіўна, бо «Беларус» — не проста трактар — гэта наш нацыянальны брэнд і такі ж сімвал, як зубр, Белавежская пушча ці Нацыянальная бібліятэка. Таму на прадпрыемстве і яго кіраўніцтве ляжыць вялізная адказнасць. Бо збіраць на канвееры патрэбна толькі якасных, прагрэсіўных, канкурэнтаздольных «Беларусаў» — запатрабаваных у розных кутках зямнога шара, іначай ніяк.
І трэба адзначыць, што МТЗ, якое за сваю 66-гадовую гісторыю ператварылася ў буйнейшага сусветнага вытворцу сельскагаспадарчай тэхнікі, з гэтай задачай паспяхова спраўляецца.

Задавальненне пакупнікоў у аснове поспеху

За апошнія 10 гадоў прадпрыемствам была асвоена вытворчасць лінейкі магутнасцяў: ад мотаблокаў (5 конскіх сіл) да магутных энерганасычаных трактароў (355 к.с.). Сегмент больш магутнай тэхнікі — трактары для асаблівых умоў эксплуатацыі — выпускаць серыйна немэтазгодна. Зараз асноўная задача ў развіцці асартыменту — упісацца ва ўсе кліматычныя і тэхналагічныя сельскагаспадарчыя зоны, выпускаць тэхніку, якая будзе адпавядаць усім экалагічным стандартам рынку збыту і пакупніцкай здольнасці.

Так, калі ў Еўропу і Амерыку ідзе тэхніка, выпушчаная згодна з жорсткімі экалагічнымі паказчыкамі, то пакупнікамі Азіі і Афрыкі запатрабаваны больш танныя мадэлі. І сёння намаганні прадпрыемства скіраваны на тое, каб як мага шырэй прадставіць свой асартымент на розных рынках за кошт новых мадэляў і мадыфікацый, якія адпавядалі б спецыфіцы кожнага асобна ўзятага рэгіёна.

Асаблівасці нацыянальнага трактарабудавання

Штогод МТЗ пашырае сферу свайго ўплыву, асвойваючы новыя рынкі збыту і забяспечваючы вельмі салідную долю экспартнага патэнцыялу краіны. На беларускім рынку прадпрыемства рэалізуе да 10% ад аб'ёму продажу — астатнія 90% ідуць на экспарт у больш за 60 краін свету. У прадпрыемства добра развіта сэрвісна-дылерская сетка, наладжана зборачная вытворчасць у 14 краінах. Шэсць прадпрыемстваў па зборцы працуюць у Расійскай Федэрацыі, два — ва Украіне, а таксама ў Азербайджане, Казахстане і Кыргызстане. Працуюць зборачныя канвееры МТЗ і за межамі СНД — у Польшчы, Латвіі, Румыніі, Эфіопіі, Кітаі, Егіпце, Сербіі, Алжыры і Венесуэле.

Простыя і надзейныя мадэлі МТЗ-512 і МТЗ-522 запатрабаваны на рынках Пакістана, Афганістана, В'етнама. Часта заказчыкі просяць тэхніку без кабіны, з простай гідраўлікай. Але гэта надзейная і даўгавечная тэхніка. «Як аўтамат Калашнікава», — жартуюць самі пакупнікі. А вось у Англію, Францыю, Германію ідуць мадэлі серыі 900, 1000, 1200, якія адпавядаюць вышэйшаму еўрапейскаму стандарту Stage 3B з сучаснай гідраўлікай, электронікай, сістэмай падачы паліва з электронным кіраваннем. Зараз на еўрапейскі рынак пастаўляюцца ў асноўным энерганасычаныя мадэлі магутнасцю 130,150, 200 к.с. і новыя — у 355 к.с.

Увогуле, калі браць лінейку тэхнікі магутнасцю ад 80 к.с., то сёння МТЗ уваходзіць у тройку сусветных лідараў.

Новы «Беларус»: гібрыдны рухавік і каробка-аўтамат

Сёння канструктарская база прадпрыемства дазваляе ў кароткія тэрміны ўносіць змены ў базавыя канструкцыі і арганізаваць вытворчы працэс. Таму навінкі ў асартыменце прадпрыемства з'яўляюцца даволі часта, а калі больш дакладна — па меры ўзнікнення патрэбы ў патэнцыяльных пакупніколў. Напрыклад, для садаводчых гаспадарак патрэбна больш вузкая тэхніка, іншыя заказваюць трактары з трансмісіяй з павялічанай колькасцю перадач. І МТЗ мае магчымасць запусціць партыю ў вытворчасць, затраціўшы на падрыхтоўчы працэс усяго 3-6 месяцаў.

Трактар **«Беларус» 3522** — новая, самая магутная, 355 (конскіх сіл) тэхніка вытворчасці МТЗ. Ён разлічаны на патрэбы гаспадарак з плошчай больш за 5 000 га, з развітай тэхніка-тэхналагічнай базай, бо патрабуе выкарыстання адначасова некалькіх адзінак навяснога абсталявання. Такі трактар можа адначасова рыхліць, баранаваць, уносіць мінеральныя ўгнаенні і насенне, на практыцы ён можа замяніць 8-10 звычайных трактароў. На «Беларус» 3522 усталяваны рухавік новага пакалення фірмы «Дойц», які адпавядае патрабаванням Stage — 3В па экалогіі. Акрамя таго, машына абсталявана мадэрнізаваным маторным адсекам з сістэмай ахалоджвання павышанай эфектыўнасці, а таксама мадэрнізаванай трансмісіяй. На гэтым трактары павялічаны тыпапамер шын і іх апорная здольнасць, павышана прадукцыйнасць гідрасістэмы. І гэтыя перавагі ўжо ацанілі многія гаспадаркі Беларусі і Расіі. Перспектывы ў гэтай мадэлі добрыя, лічаць на МТЗ, абапіраючыся на вопыт запуску ў вытворчасць папярэдняй мадэлі магутнасцю 300 к.с., аб'ёмы вытворчасці якой узраслі за даволі кароткі перыяд з 30 да 140 адзінак за месяц.

Гэты трактар стаў не адзінай новай машынай у шэрагу энерганасычаных «Беларусаў». Запушчаны ў серыйную вытворчасць і **«Беларус» 2422** магутнасцю 210 конскіх сіл. Яго распрацоўка — далейшае развіццё серыі 2000 з ужываннем аўтаматызаванай трансмісіі з пераключэннем перадач пад нагрузкай, сучаснай гідранавясной сістэмы і электрагідраўлічным кіраваннем. У асноўную камплектацыю гэтай машыны ўваходзяць пярэдняе навяснае прыстасаванне і пярэдні вядучы мост, кандыцыянер, а таксама рухавік, які адпавядае патрабаванням Stage — 3В па экалогіі.

Цікавы факт:
Сёння ў свеце налічваецца больш за 100 вытворцаў трактароў. Аднак толькі 8 з іх забяспечваюць 96% агульнага аб'ёму сусветнага рынку збыту гэтай тэхнікі, і Мінскі трактарны завод уваходзіць у іх лік.

Акрамя таго, на рынак выведзена мадэль **«Беларус» 1220,3.** Гэты трактар закліканы запоўніць нішу ў магутнасным дыяпазоне 100-130 конскіх сіл. У ім захаваны ўсе перавагі «Беларуса» 1221,2, які карыстаецца на гэтым рынку збыту ўстойлівым попытам. На тракторы ўстаноўлены пярэдні вядучы мост павышанай апорнай здольнасці, гідранавясная сістэма павышанай грузападзёмнасці на аснове гідрападымальніка, а таксама сінхранізаваная каробка перадач 16/4. А за кошт устаноўкі 4-цыліндровага дызеля паменшаны габарыты і маса трактара, палепшана эканамічнасць і зніжаны затраты па эксплуатацыі. У **«Беларуса» 1220,3** — абноўлены дызайн, глушыцель канструктыўна выкананы ў цені правай стойкі кабіны.

Таксама спецыялісты канструктарскага ўпраўлення стварылі шэраг мадэляў трактароў для краін, якія развіваюцца. Гэта спрошчаныя машыны, распрацаваныя з улікам патрабаванняў рынкаў Азіі і Афрыкі (кампактны «Беларус» 311), і ўніверсальна-абганяльныя трактары мадэляў 511, 512, 911, 912.

«Беларус» 3023 — гэта сёння самая інавацыйная распрацоўка МТЗ, знакавая не толькі для прадпрыемства, але і для сусветнай трактарабудаўнічай галіны. Таму што абсталяваць трактар электрамеханічнай трансмісіяй не змог яшчэ ні адзін вытворца, а МТЗ сёлета запускае ў вытворчасць эксперыментальную партыю, якая будзе выпрабоўвацца на палях Беларусі і Расіі.

У гэтай мадэлі механічную каробку перадач замяняе генератар і электрарухавік, які выконвае ролю рухаючага элемента, а бесступенчатая трансмісія аўтаматычна выбірае рэжым працы. Кіроўца толькі задае тэхналагічную хуткасць і нагрузку, далей машына працуе ў аўтаматычным рэжыме. Гэта дае магчымасць эканоміць на асобных відах аперацый да 25% паліва. А з-за пастаяннага росту цэн на паліва ноу-хау Мінскага трактарнага завода становіцца яшчэ больш значным. Нездарма трактар «Беларус» 3023 адзначаны сярэбраным медалём на міжнароднай сельскагаспадарчай выставе ў Гановеры.

У лінейцы навінак прадпрыемства з нядаўняга часу прадстаўлены і гусенічныя трактары. **«Беларус» 2103** цягавага класа 4 з рызінаарміраванымі гусеніцамі, прызначаны для працы ў сельскай гаспадарцы з навяснымі, паўнавяснымі, прычапнымі машынамі, у тым ліку для работ агульнага прызначэння на забалочаных глебах. **«Беларус» 1502-01** прызначаны для працы на слабых і вільготных грунтах у агрэгаце з меліярацыйнымі, сельскагаспадарчымі і іншымі машынамі і прыладамі. **«Беларус» 1502** прызначаны для працы ў агрэгаце з бульдозерным абсталяваннем па распрацоўцы грунтоў I-II катэгорый на будаўніцтве дарожных, прамысловых, гідратэхнічных і іншых аб'ектаў. Перспектыўнымі рынкамі для такой тэхнікі з'яўляюцца рынкі Расіі, Украіны, Казахстана.

ВА «МТЗ» у лічбах:

Мінскі трактарны завод быў заснаваны 29 мая 1946 года.

Сёння ў вытворчае аб'яднанне «МТЗ» уваходзяць 8 прадпрыемстваў рэспублікі, а таксама іх даччыныя прадпрыемствы.

На прадпрыемстве працуе больш за 30 000 чалавек.

На працягу шэрагу гадоў завод захоўвае за сабой долю ў 8-10% ад сусветнага рынку колавых трактароў, знаходзячыся ў васьмёрцы найбуйнейшых сусветных вытворцаў.

Прадпрыемства шырока прадстаўлена на рынках больш як 60 краін свету.

Штогод тэхніка пад маркай «Беларус» удзельнічае ў 70 выставах.

Але толькі трактарамі навінкі вытворчага аб'яднання МТЗ не абмяжоўваюцца.

Вялікую цікавасць у заказчыкаў выклікала з'яўленне новай мадэлі шасі ўніверсальнага **«Беларус» Ш-406** з наборам рабочага абсталявання для абслугоўвання і рамонту аўтамабільных дарог вытворчасці гомельскага завода «Гідрапрывад». У камплект уваходзяць навясныя прылады для ачысткі снегу з крывалінейнага бруса, ротарны снегаачышчальнік, снегаачышчальны адвал, абсталяванне для мыцця шумазахістных агароджаў, шчотачнае абсталяванне, ямабур, гідрамолат і іншае.

Для прадпрыемстваў з вялікімі плошчамі і чыгуначнымі веткамі будзе цікавай універсальная машына **«Беларус» МУ-466** вытворчасці таго ж гомельскага «Гідрапрывада», якая можа ехаць і па дарозе, і па рэйках (можа буксіраваць да 350 тон) і выкарыстоўвацца для выканання манеўровых работ на ўнутрызаводскіх чыгуначных шляхах з каляінай 1520 мм, а таксама для круглагадовага абслугоўвання і ўборкі дарог агульнага карыстання, добраўпарадкавання вытворчых тэрыторый. Машына абсталявана дзвюма пляцоўкамі складальніка, аўтаномным падагравальнікам рухавіка, дадатковай светавой чыгуначнай сігналізацыяй, радыёсувяззю, прадугледжана магчымасць здвойвання колаў.

УНП 101483199

Унікальны «Трактар»

На базе выпрабавальнага цэха працуе ўнікальны для краін СНД цэнтр «Трактар», які мае права праводзіць сертыфікацыйныя іспыты, пратаколы якіх прызнаюцца ўсімі сусветнымі экспертнымі арганізацыямі. Пакуль «Трактар « не быў акрэдытаваны, сертыфікацыя для Еўрапейскага рынку праводзілася ў Англіі, Францыі, што займала шмат часу і каштавала вельмі дорага. Акрамя таго, гэта моцна «тармазіла» выхад новых мадэляў і мадыфікацый на еўрапейскі рынак.

У 2009 годзе выпрабавальны цэнтр «Трактар» быў акрэдытаваны ў якасці знешняй выпрабавальнай лабараторыі сусветна вядомай выпрабавальнай лабараторыі DEKRA. Што значна пашырыла экспартныя магчымасці прадпрыемства на рынку Заходняй Еўропы і Амерыкі.

ЖАНЧЫНЫ РАДЫ КЛЮЧАМ

Асабліва, калі гэтыя ключы — ад камбайнаў, а жанчыны кіруюць сельскімі гаспадаркамі.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік урачыста перадаў ключы ад камбайнаў жанчынам, якія ўзначальваюць 12 сельскіх гаспадарак у рэгіёне. Такая акцыя — даніна павагі за іх нялёгкую працу. Жанчыны таксама першымі ў вобласці ўвесну атрымалі для сваіх гаспадарак энерганасычаныя трактары.

— Хачу настроіць усіх аграрыяў на эфектыўную працу і дасягненне высокіх вынікаў у сельгасвытворчасці. А новая тэхніка павінна стаць у гэтай справе добрай падмогай, — сказаў Пётр Руднік.

Увогуле Магілёўская вобласць атрымала ад дзяржавы 85 збожжаўборачных камбайнаў па лізінгу.

Ілона ІВАНОВА.

ПЧОЛЫ... ДАПАМОГУЦЬ АГРАРЫЯМ

Упершыню ў Лёзненскім раёне пачалі вырошчваць грэчку. Для яе адведзена пяцьдзясят гектараў, якія належаць гаспадарцы «Крынкі».

Вядома, што пры вырошчванні грэчкі вельмі важным з'яўляецца дадатковае апыленне пчоламі. Без яго можна недаатрымаць да 40 працэнтаў будучага ўраджаю. І паколькі ў самой гаспадарцы не займаюцца пчалярствам, кіраўнікі сельскагаспадарчага прадпрыемства папрасілі дапамогі ў тутэйшых пчаляроў. Ад іх толькі і патрабуецца, што своечасова прывезці вуллі ў поле — на час цвіцення грэчкі. Калі разабрацца, пчалярам вельмі выгадна супрацоўніцтва з аграрыямі, бо грэчка — выдатны меданос. Пры спрыяльным надвор'і ўсяго толькі адна пчаліная сям'я за суткі здольная сабраць з кветак грэчкі да пяці кілаграмаў мёду. Падлічана, што ўсяго ў якасці памочнікаў аграрыяў спатрэбіцца да 150 сем'яў пчол.

У гаспадарцы запланавалі сабраць добры ураджай грэчкі. На Віцебскі камбінат хлебапрадуктаў павінны здаць не менш за 30 тон. Вопыт засваення рэдкіх сельскагаспадарчых культур у гаспадарцы ўжо ёсць. Напрыклад, ужо пяць гадоў тут паспяхова вырошчваюць піваварны ячмень.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Утерянные представительством Белгосстраха по Партизанскому району г. Минска бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 0670705 и по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств — членов системы «Зеленая карта» серии BY/01 № 6289069 **считать недействительными.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Нерудпром» (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже корпуса первичного дробления (здание обрабатывающей промышленности иного назначения инв. № 600/С-59856), об. пл. 381 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, Минский р-н, севернее д. Захаричи.**

Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 409 920 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,0339 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Объект обременен договором аренды.

Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 10.01.2012.

Аукцион состоится **15.06.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.06.2012** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

Паритетбанк

www.paritetbank.by

«Открытое акционерное общество «Паритетбанк», расположенное по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а, СООБЩАЕТ, ЧТО 18 ИЮНЯ 2012 ГОДА *в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк»* ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О процедурных вопросах.
2. О некоторых вопросах Наблюдательного Совета банка.

Собрание проводится по адресу:
г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 1 июня 2012 года.

Бюллетени для заочного голосования и другие материалы к собранию участники собрания могут получить по указанному адресу с 11 июня 2012 года по 12 июня 2012 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 14 июня 2012 года по месту проведения Общего собрания акционеров, дата подсчета голосов – 15 июня 2012 года.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Паритетбанк» в указанном порядке, которые включаются в одноименный список.

Телефон для справок: 288 64 74.

Наблюдательный Совет ОАО «Паритетбанк».

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 5 от 27.10.2006 г. УНП 100233809.

БЕЛАГРА-2012

Адкрытае акцыянернае таварыства
«БРЭСТСЕЛЬМАШ»
Рэспубліка Беларусь,
224001 г. Брэст,
вул. Паплаўскага, 23.
Тэл.: (0162) 28-13-65,
28-11-52, 28-13-21.
Факс: (0162) 28-12-79,
28-18-46.
E-mail: brestselmash@tut.by
УНП 200019439

«Брэстсельмаш» — ТАМ, ДЗЕ ПАТРЭБНА ЦЯПЛО!

Цеплагенератары, паветранагравальнікі, топачныя агрэгаты і іншае цеплавое абсталяванне, якое выпускае ААТ «Брэстсельмаш» ужо больш за 35 гадоў, — эканамічнае надзейнае і зручнае ў эксплуатацыі. Гэта могуць пацвердзіць работнікі многіх прадпрыемстваў, дзе яно выкарыстоўваецца (жывёлагадоўчых фермаў, птушкафабрык, цяпліц, вытворчых цэхаў і іншых аб'ектаў), і не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Малдове, ва Украіне, іншых краінах СНД. Але лепш за словы могуць сказаць лічбы: за мінулы год прадпрыемства ўдвая павялічыла аб'ёмы вытворчасці і больш прадукцыі стала пастаўляць на экспарт.

Сёлета на Белагра ААТ «Брэстсельмаш» прадэманструе наведвальнікам 17 найбольш перспектыўных і інавацыйных адзінак тэхнікі, якая можа зацікавіць розныя сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Так што, калі вас цікавіць пытанне, як аптымальна наладзіць ацяпленне памяшканняў, арганізаваць сушку драўніны ці траў, прадэзынфіцыраваць склады, цяпліцы, рацыянальна ўнесці ўгнаенні, прыходзьце да стэнда прадпрыемства на выставачнай пляцоўцы ў Гастэлаўскім Мінскага раёна.

ДАВЕДКА:

ААТ «Брэстсельмаш» — прадпрыемства з багатай гісторыяй і ўнікальным для нашай краіны вопытам вытворчасці цеплавых агрэгатаў і ўстановак, якія з'яўляюцца «асновай» асартыменту прадукцыі: блокавых гарэлак і паветранагравальнікаў, цеплагенератараў і топачных агрэгатаў, зернесушылак і зернеачышчальна-сушыльных комплексаў. Гэта адзін з вядучых вытворцаў спецыяльнага абсталявання для сельскай гаспадаркі. Утрымліваючы лідарства ў Беларусі, кампанія актыўна дзейнічае на рынках СНД, з кожным крокам пашыраючы геаграфію паставак і развіваючы сувязі з канчатковымі спажыўцамі.

У рамках дзяржпраграмы

Добры, у час сабраны ўраджай зернавых робіць вялікі гонар нашым земляробам. Але на гэтым іх справа і клопат яшчэ не скончаны, бо вынікі сваёй працы трэба захаваць, і захаваць да наступнай восені. Зрабіць гэта без дапамогі сушыльнай тэхнікі практычна немагчыма, але ў многіх гаспадарках яна патрабуе карэннай мадэрнізацыі ці замены. ААТ «Брэстсельмаш» з'яўляецца пастаянным удзельнікам дзяржпраграмы па аднаўленні зернесушыльнай гаспадаркі. За мінулы год у гаспадарках Брэсцкай вобласці было ўсталявана 30 зернесушыльных комплексаў яго вытворчасці. На гэты год запланавана ўстаноўка яшчэ 28.

Зернеачышчальна-сушыльныя комплексы стацыянарныя адкрытага тыпу ЗСК-30 прызначаны для пасляўборачнай латочнай апрацоўкі збожжавых, зернебабовых, крупяных і іншых культур. Сам комплекс агульнай вагой каля 70 тон складаецца з прыёмнага, зернеачышчальнага, сушыльнага аддзяленняў, бункера часовага захоўвання зерня, сістэмы зернеправодаў, металічных канструкцый, сістэмы кантролю і ўпраўлення тэмпературай, светавой і гукавой сігналізацыяй.

Зыходная вільготнасць зерняўвараху — да 30%. Засмечанасць — да 3%, у тым ліку ўтрыманне крупяной прымесі — да 0,5%. Выхад гатовай прадукцыі — 80% ад агульнай колькасці зерняўвараху.

Зернеачышчальна-сушыльныя комплексы ЗСК-20 і ЗСК-30 могуць пастаўляцца з зернесушылкамі, якія працуюць на газавым або вадкім паліве, электрычнай энергіі. Узровень механізацыі вытворчых працэсаў на ЗСК — 100%. Усе аперацыі па прыёмцы, апрацоўцы, сушцы і транспарціроўцы збожжа, водпуску гатовай прадукцыі і адходаў — механізаваныя.

Прафесійныя мантажныя брыгады прадпрыемства і райаграсэрвісы ў сціслыя тэрміны праводзяць мантаж зернесушыльнага комплексу ў гаспадарках-заказчыках і надалей працягваюць іх аператыўнае і прафесійнае гарантыйнае абслугоўванне.

Але 30 тон за гадзіну — гэта далёка не апошнія лічбы ў вытворчай магутнасці брэсцкіх зернесушылак. Ужо сёлета падрыхтаваны да мантажу комплекс прадукцыйнасцю 40 т/г, распрацоўваецца дакументацыя на 50 і 60 т/г.

Укладанні ў мадэрнізацыю сябе акупляюць

Прадпрыемства ўкладвае вялікія сродкі ў закупку новага абсталявання, удасканаленне вытворчага працэсу. Так, ужо зманціравана і хутка пачне работу ўнікальная для Беларусі выпрабавальная лабараторыя для гарэлак вялікай магутнасці. Тэсціраванне абсталявання на яе стэндах дасць магчымасць знізіць да мінімуму брак і тым самым затраты па гарантыйным і паслягарантыйным абслугоўванні, паскорыць запуск у вытворчасць новых мадэляў. Больш высокая якасць прадукцыі будзе спрыяць умацаванню станоўчага іміджу прадпрыемства на ўнутраным і знешнім рынках.

Закуплены і ў хуткім часе будуць уключаны ў вытворчы працэс лістагібныя станкі, гільяціна і шэраг іншых, неабходных адзінак абсталявання. На іх у прадпрыемства вялікія планы.

Асартымент прадукцыі:

Агрэгаты навясныя АВУ-0,8 і АВУ-1,5. Цалкам аўтаматызаваныя, разлічаныя на загрузку адпаведна 0,8 і 1,5 тоны.

Норыі цэнтрабежныя каўшовыя аднапаточныя НЦК-1-10, НЦК-1-40, НЦК-1-60, НЦК-1-80

Зернеачышчальна-сушыльныя комплексы стацыянарныя адкрытага тыпу ЗСК-20, ЗСК-30, ЗСК-40

Гарэлкі блочныя вадкапаліўныя серыі ГБЖ з цеплавой магутнасцю да 3 МВт.

Гарэлкі блокавыя газавыя серыі ГБГ з цеплавой магутнасцю да 4 МВт.

Цеплагенератары вадкапаліўныя ТГЖ-0,06, ТГЖ-0,18, ТГЖ-0,29.

Цеплагенератары газавыя ТГГ-0,29, ТГГ-0,18.

Паветранагравальнікі газавыя серыі ВГ на прыроднай газе магутнасцю 40, 70 і 90 кВт.

Агрэгаты топачныя вадкапаліўныя АТ-0,3, АТ-0,7, АТ-1,6, АТ-2,5.

Агрэгаты топачныя на газавым паліве АТ-0,3; АТ-0,7.

Катлы бытавыя ацяпляльныя вадагрэйныя серыі Кст, цвёрдапаліўныя і ўніверсальныя.

Катлы вадагрэйныя ПЭ-0,05, ПЭ-0,09.

Навінкі — на выставу

Сёлета на выставе Белагра ААТ «Брэстсельмаш» прадэманструе навінкі ўласнай вытворчасці, якія ўжо выклікаюць вялікую цікавасць з боку спецыялістаў.

Так, на лютаўскім ветэрынарным форуме, што праходзіў сёлета ў Віцебску, быў прадэманстраваны крэматар для спальвання біяматэрыялу арганічнага паходжання (трупы жывёл, птушак, лабараторнага матэрыялу і г.д.). **Крэматар** уяўляе сабой ёмістасць з вогнетрывалай тэрмаізаляцыйнай пракладкай, укамплектаваная гарэлкай на вадкім ці газавым паліве, блокам кіравання з таймерам і тэрмадатчыкам. Аб'ём загрузкі крэматара — да 100 кг, тэмпература рабочага рэжыму — 715—760 °С. Яго перавагай над замежнымі аналагамі, якія прадстаўлены сёння на рынку Беларусі, з'яўляецца больш нізкая цана, сэрвіснае абслугоўванне на базе прадпрыемства; з тэхнічных — магчымасць дазагрузкі. У планах прадпрыемства — пашыраць мадэльны рад крэматараў за кошт павелічэння аб'ёму рабочай ёмістасці і магутнасці гарэлкі.

Яшчэ адна навінка, якая не мае айчынных аналагаў на беларускім рынку — **тэрмамеханічны аэразольны генератар ГТА-100.** Ён прызначаны для дэзынфекцыі складоў, жывёлагадоўчых фермаў, цяпліц і іншых нежылых памяшканняў. Гэты прыбор здольны за кароткі час стварыць і распаўсюдзіць інсектыцыднае воблака вялікага аб'ёму і забяспечыць хуткае знішчэнне хваробатворных бактэрый і насякомых. Аэразольны туман пранікае ў драбнюткія расколіны, адтуліны.

Выпушчаны першыя экзэмпляры **газагенератарных установак ГГ-0,09** на пілавінні і шчэпках для ацяплення вытворчых памяшканняў, сушкі драўніны, траў, іншых матэрыялаў. Газагенератарная ўстаноўка працуе ў аўтаматычным рэжыме з падтрымкай зададзенага тэмпературнага рэжыму.

У аснову працы газагенератара закладзены прынцып спальвання разам з сыравінай дрэўнага газу, які выпрацоўваецца. Падобныя ўстаноўкі значна больш эфектыўныя, чым звычайныя цвёрдапаліўныя катлы, каэфіцыент карыснага дзеяння якіх не перавышае 80%. У сваю чаргу, ККД газагенератараў за кошт аптымізацыі спальвання паліва дасягае 90%. Адначасова, што вельмі важна, пры выкарыстанні падобных агрэгатаў вырашаецца праблема экалогіі за кошт зніжэння шкодных выкідаў у атмасферу і ўтылізацыі адходаў.

Яшчэ адна навінка, якая сёлета з'явіцца на беларускім рынку, — гэта **піролізны кацёл на цвёрдым паліве** для ацяплення прыватных домаўладанняў. Яго перавагай будзе значная эканомія паліўных рэсурсаў для падтрымання патрэбнай тэмпературы. Так, калі звычайнаму цвёрдапаліўнаму катлу на суткі патрэбна 3-4 загрузкі, то піролізны абыдзецца 1-2. Гэтая значная эканомія хутка акупіць цэнавую разбежку піролізнага катла ў параўнанні са звычайным.

Экспартны патэнцыял

Сёння доля экспарту ў агульным аб'ёме продажу ААТ «Брэстсельмаш» складае каля 25%, і гэта далёка не апошнія лічбы. Сёлета ў прадпрыемства ёсць усе шанцы выйсці на экспартны аб'ём у 30% ад агульнага.

Адной з галоўных задач развіцця кіраўніцтва прадпрыемства бачыць у павелічэнні экспарту і пашырэнні геаграфіі збыту. Таму штогод «Брэстсельмаш» удзельнічае ў 20 выставах за межамі Беларусі. Аб адпаведнасці вырабаў завода сучасным патрабаванням сведчаць шматлікія ўзнагароды і дыпломы міжнародных выстаў і салонаў, конкурсаў «Лепшыя тавары Беларусі на рынках Расіі» і нацыянальнага конкурсу ў намінацыі «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, пашыраецца дылерская сетка ў рамках краін СНД, вядуцца перамовы аб адкрыцці буйнога сэрвісна-дылерскага цэнтра ў Ніжнім Ноўгарадзе з магчымасцю стварэння зборачнай вытворчасці зернесушыльных комплексаў.

Гаючая сіла беларускай прыроды ў руках руплівых гаспадароў



ДАВЕДКА

ААТ «Белаграздраўніца» ўжо больш за 30 гадоў займаецца арганізацыяй санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення. Штогод установы арганізацыі наведваюць каля 50 тысяч дарослых і дзяцей. У склад аб'яднання ўваходзяць санаторыі «Радон», разлічаны на 450 дарослых наведнікаў з дзіцячым аддзяленнем «Баравічок» на 170 месцаў, «Сасновы бор» — на 280, «Парэчча» — таксама на 280, «Рассвет-Любань» — 215 дарослых і 150 дзяцей у аддзяленні «Зарніца»; таксама дзіцячыя санаторыі «Случ», «Расінка», «Сонейка», «Налібоцкая пушча», разлічаныя на 1456 месцаў, што складае больш за 60% дзіцячага санаторнага фонду Беларусі. Летась усе санаторыі прайшлі атэстацыю Рэспубліканскай камісіі і пацвердзілі высокі статус санаторна-курортных арганізацый першай катэгорыі, а ААТ «Белаграздраўніца» было прызнана лепшым санаторна-курортным аб'яднаннем нашай рэспублікі.

КАЗКА ПРА ЖЫВУЮ ВАДУ

Хто ў дзяцінстве не чуў казак пра жывую ваду, якая вылечвала любыя хваробы, раны, ставіла нямоглых на ногі і нават падымала з магіл? Шкада, што разам з дзяцінствам мы страчваем веру ў цуды, якія здаваліся раней такімі рэальнымі. Але ці казачныя тыя цуды? Многія наведнікі санаторыяў «Белаграздраўніцы» паверылі ў іх рэальнасць і выпрабавалі на сабе гаючую сілу ўнікальнай «жывой» вады з недраў беларускай зямлі. Таму і прыязджаюць сюды зноў і зноў. А яна і сапраўды, нібы чароўная, дорыць здароўе і сілы кожнаму, хто п'е з яе вытокаў.

У казках па жывую ваду трэба было ехаць за край свету, а ў рэальнасці — яна побач, і выпрабаваць яе на сабе можна, наведаўшы адзін з санаторыяў «Белаграздраўніцы».

СТРЭС ЦІ АЗДАРАЎЛЕННЕ — ВЫБАР ЗА ВАМІ

Штогод сотні тысяч нашых суайчыннікаў імкнуцца паправіць здароўе на марскіх курортах Крыма, Турцыі, Балгарыі, Егіпта і іншых краін, свята веручы, што альтэрнатывы ў плане павышэння імунітэту марскому ўзбярэжжу няма. І нават не падазраюць, як памыляюцца. Многія імунолагі лічаць, што папраўляць здароўе трэба менавіта ў зонах кліматычнага пражывання. Больш за тое, адпачынак на працягу 10-14 дзён ва ўмовах іншага клімату (напрыклад, з высокімі тэмпературамі і нізкай вільготнасцю) можа быць нават шкодным. Бо арганізму патрэбен недзе тыдзень для акліматызацыі, і толькі потым кліматычныя ўмовы пачынаюць прыносіць карысць. Але сцэнарый адпачынку звычайна іншы. Прыехаўшы ці прыляцеўшы на марское ўзбярэжжа, нашы суайчыннікі кідаюцца напоўніцу выкарыстоўваць сонца, мора, мясцовую кухню, заганяючы свой арганізм у стан глыбокага стрэсу, з якім той пачынае спраўляцца звычайна толькі ў сярэдзіне другога тыдня адпачынку, але гэта ўсяго за некалькі дзён да вяртання на радзіму. А там зноў тыдзень на акліматызацыю, які ў многіх праходзіць з рознымі, часцей прастуднымі, віруснымі захворваннямі на фоне зніжэння імунітэту. Менавіта таму адпачынак на радзіме выгадна адрозніваецца ад вандровак на далёкі поўдзень. І гэта што тычыцца здаровых людзей.

Трэба адзначыць, што нам, беларусам, пашчасціла жыць на зямлі, дзе захаваліся куткі першабытнай прыроды, некранутыя ўрбанізацыяй. Менавіта сярод такіх векавых лясоў, першародных лугоў, крыніц і рэк, якія лечаць душу і цела, калі проста знаходзішся побач, і размешчаны санаторыі ААТ «Белаграздраўніцы».

НЕРВЫ ПАПРАЎЛЯЕМ У «САСНОВЫМ БАРЫ», СТРАВАВАННЕ — У «ПАРЭЧЧЫ», А МУЖЧЫНСКАЕ ЗДАРОЎЕ Ў САНАТОРЫІ «РАССВЕТ-ЛЮБАНЬ»

Усе санаторыі «Белаграздраўніцы» пабудаваны на крыніцах мінеральных водаў, якія, у залежнасці ад саставу, вызначылі іх медыцынскі профіль.

У **«Парэччы»** — мінеральныя воды Друскінінкайскага тыпу, уласцівасці якіх неаднаразова адзначаліся найвышэйшымі ўзнагародамі сусветных выстаў, у тым ліку залатым медалём Парыжскай выставы. Яны спрыяюць вылечванню хвароб органаў стрававання, касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі. Ды знаходзіцца санаторый усяго ў 17 кіламетрах ад сусветна вядомага курорта (я маю на ўвазе Друскінінкай). Так што там не толькі мінеральныя воды аднаго тыпу, але і паветра, і прырода... Толькі вось цэны на аздараўленне адрозніваюцца амаль у два разы. Так, 14 дзён адпачынку ў «Парэччы» ў стандартным аднаместным нумары абыдзецца прыкладна ў 3 190 000 — 3 400 000 руб. (невялікая разбежка па цэнах можа быць у залежнасці ад выбранага корпуса). У кошт уваходзіць 5-разовае харчаванне па ўзгодненым меню і 8-9 медыцынскіх працэдур на дзень. Для наведнікаў санаторыя працуюць «Цэнтр прыгажосці», «Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны» з высокакваліфікаванымі спецыялістамі, сучасная трэнажорная зала, водны комплекс з басейнамі для дзяцей і дарослых, ваннамі джакузі і японскай лазняй «Афура». Апошнія гады паспяхова выкарыстоўваюцца методыкі лячэння натуральнымі сокамі — сокатэрапія. А вось, напрыклад, у санаторыі «Draugyste» ў г. Друскінінкай тыя ж 14 дзён абыдуцца вам 9 200 000 (без афармлення выязных дакументаў) з 3-разовым харчаваннем па ўзгодненым меню і 4-5 працэдурамі на дзень (звесткі сайта http://www.baltia-tour.ru).

Санаторый **«Рассвет-Любань»** спецыялізуецца на захворваннях мочавыдзяляльнай сістэмы і нырак, парушэннях палавой функцыі ў мужчын, захворваннях органаў дыхання, касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, абмену рэчываў, павышэнні імунітэту. У аснове санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення ляжыць выкарыстанне натуральных прыродных фактараў: унікальнай прыроднай мінеральнай вады, аналага трускавецкай, у выглядзе ваннаў і пітва, прыроднай сапрапелевай лячэбнай гразі, Спелеакліматалякарні тыпу Салігорскай, гіруда- і апітэрапіі.

На базе санаторыя працуе Цэнтр мужчынскага здароўя, які спецыялізуецца на лячэнні эрэктыльнай дысфункцыі ў мужчын, у ім наведнікі санаторыя могуць атрымаць кансультацыі спецыялістаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускай медыцынскай акадэміі.

Сумесна з кафедрай уралогіі і нефралогіі БелМАПА распрацавана і паспяхова выкарыстоўваецца праграма прафілактыкі і лячэння прыроднай мінеральнай вадой пацыентаў з рознымі захворваннямі нырак, у тым ліку пасля драблення камянёў.

Недалёка ад Мінска, у Маладзечанскім раёне, размешчаны яшчэ адзін санаторый ААТ «Белаграздраўніца» — **«Сасновы бор»**, які спецыялізуецца на лячэнні захворванняў нервовай сістэмы, органаў дыхання, стрававання, мочапалавой сістэмы і сістэмы крыватоку. Два гады запар, у 2008 і 2009-ым, санаторый прызнаваўся лепшым у рэспубліцы. Тут створаны ўнікальны для Беларусі гідрапарк з сістэмай фантанаў і каскадаў. А мінеральную ваду чартакскага тыпу са свідравіны, што знаходзіцца на тэрыторыі санаторыя, можна піць праз эксклюзіўны бювет, аналагаў якому ў нашай краіне няма.

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Запрашаем вас наведаць нашы санаторыі. Мы ўпэўнены, што дзівосы беларускай прыроды, добразычлівасць і прафесіяналізм нашых супрацоўнікаў, сучасная медыка-дыягнастычная база дапамогуць вам аднавіць і ўмацаваць сваё здароўе на доўгія гады. Менавіта для гэтага мы і працуем.

З павагай, генеральны дырэктар ААТ «Белаграздраўніца».
І.Ф. АВЕРЧАНКА.

Забраніраваць і набыць пуцёўкі можна па адрасе:
вул. Фабрыцыуса, 7а, 220007, г. Мінск.
Па тэлефонах: тэл.: (017) 200 44 64, 298 54 00,
факс: (017) 200 44 64, 200 40 53, e-mail: info@agrozdrav.by.
На сайце прадпрыемства: http://www.agrozdrav.by
УНП 100119014

ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫЯ ПАКАЛЕННІ

Нельга абмінуць вялізную работу па планавым аздараўленні і лячэнні дзяцей, якая вядзецца дзіцячымі санаторыямі «Белаграздраўніцы» — «Случ», «Сонейка», «Налібоцкая пушча», «Расінка», дзіцячымі аддзяленнямі «Баравічок» санаторыя «Радон» і «Зарніца» санаторыя «Рассвет-Любань». Усе санаторыі прымяняюць сучасныя лячэбна-дыягнастычныя методыкі, такія як спелеакліматалячэнне, электрасвятлолячэнне, лазерамагнітатэрапія і інш., пастаянна абнаўляецца клініка-дыягнастычная база. Так, на працягу 2008—2009 гадоў ва ўсіх санаторыях былі адкрыты спелеакліматалячэбніцы (аналаг падземных салявых пячор). У санаторыі «Расінка» паспяхова развіваецца новы для Беларусі медыцынскі кірунак — эндаэкалагічная медыцына, пражыванне пацыентаў арганізавана ў асобных экалагічных драўляных катэджах з усімі выгодамі. Уся мэбля толькі з натуральных матэрыялаў, ніякай сінтэтыкі і пластыка, нават сцежкі з дрэва. Крок з парога — і тваім здароўем займаюцца не лекары, а сама прырода. Гэтая методыка распрацавана расійскім прафесарам Левіным і прапануецца перш за ўсё тым, хто пацярпеў ад бурнага гарадскога жыцця, забруджанага паветра, шуму мегаполіса і душнага офіса. Натуральнае лячэбнае харчаванне, уласная мінеральная вада, здабытая з глыбіні 350 метраў, лячэбныя гразі проста твораць цуды з пацыентамі.

Акрамя лячэння і адпачынку, ва ўсіх дзіцячых санаторыях наладжана круглагадзічнае навучанне па школьнай праграме. Для гэтага створаны і абсталяваны сучасныя класы, працуюць высокакваліфікаваныя педагагічныя калектывы.

Гэты кірунак дзейнасці ААТ»Белаграздраўніца» ідзе ў цеснай звязцы з дзяржаўнымі праграмамі па ўмацаванні здароўя дзяцей. Таму большая частка пуцёвак выкупляецца дзяржавай. Гэта немалыя грошы, але яны не патрачаны ўпустую, а інвеставаныя ў будучыя пакаленні беларусаў.

Матэрыялы падрыхтавала Таццяна САЛАЎЁВА.

«РАДОН» — ГЭТА ЎЖО БРЭНД

І не проста гіпатэтычны — дыпламаваны, бо стаў у 2011 годзе бронзавым пераможцам прафесійнага рэспубліканскага конкурсу «Брэнд года».

«Радон» — адзін з буйнейшых і самых вядомых у нашай рэспубліцы санаторыяў. Ён размешчаны ў маляўнічым кутку Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, дзе захавалася першародная прыгажосць сасновага лесу і лугоў у месцы зліцця дзвюх рэк — Моўчадзі і Паніквы.

Медыцынскі профіль санаторыя — гэта лячэнне захворванняў касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, захворванняў нервовай сістэмы, хвароб жаночых і мужчынскіх палавых органаў. Ён абумоўлены ўнікальнымі для Беларусі натуральнымі радонавымі водамі, якія здабываюцца з глыбіні 300 м, і лячэбнымі сапрапелевымі грязямі возера Дзікае. У сукупнасці яны спрыяюць нармалізацыі ўсіх відаў абмену ў арганізме, аказваюць абязбольвальнае, супрацьзапаленчае і заспакаяльнае дзеянне, павышаюць імунітэт, паляпшаюць працу сэрца, нармалізуюць артэрыяльны ціск.

Санаторый пастаянна абнаўляе лячэбна-дыягнастычную базу, у работу ўкараняюцца новыя сучасныя медыцынскія тэхналогіі. Акрамя традыцыйнага санаторна-курортнага лячэння: фізіятэрапіі, вода- і гразелячэння шырока выкарыстоўваюцца новыя метады, напрыклад, спелеакліматалячэнне ў спелеакліматакапсуле, створанай з руды Салігорскага калійнага басейна — градзірні; працуюць Цэнтр мужчынскага здароўя і Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны. У санаторыі вядуць прыём 18 спецыялістаў, у тым ліку неўролаг, уролаг, гінеколаг, касметолаг і інш.

Пра «Радон» можна шмат гаварыць, але лепш яго наведаць, небеспадстаўна лічаць у «Белаграздраўніцы». Гэта даказвае той факт, што больш за 85% наведнікаў прыязджаюць сюды па лячэнне 2-6 разоў — па прычыне доўгатэрміновай рэмісіі і магчымасці адмовіцца ад дарагіх лекаў.

Агульным для ўсіх санаторыяў ААТ «Белаграздраўніца» з'яўляецца прымяненне ў лячэнні перадавых медыцынскіх методык пад кантролем і ў пастаянным супрацоўніцтве з вядучымі спецыялістамі галіны аховы здароўя, профільнымі кафедрамі медыцынскіх універсітэтаў і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Для аказання высокакваліфікаванай кансультацыйнай дапамогі заключаны дагаворы з вядучымі рэспубліканскімі цэнтрамі: РНПЦ Анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, РНПЦ «Кардыялогія»; Рэспубліканскай бальніцай рэабілітацыі і бальнеалячэння, НДІ фізіялогіі НАН РБ і 4-й Мінскай гарадской клінічнай бальніцай.

Пастаяннае абнаўленне медыцынскай базы, развіццё інфраструктуры і сэрвісу патрабуюць вялізных матэрыяльных укладанняў, якія потым з лішкам акупляюцца за кошт росту папулярнасці і запатрабаванасці санаторыяў.

АДПАЧЫНАК З МЯСЦОВЫМ КАЛАРЫТАМ

Тры гады таму ТАА «Агракамбінат «Дзяржынскі» распачаў на плошчы ў 500 гектараў маштабны праект — будаўніцтва цэнтра экалагічнага турызму «Станькава». Адметна, што ён узводзіцца за кошт прыбытку прадпрыемства. Тое, што тут ужо створана, сапраўды ўражвае.

У 1939 годзе менавіта па тэрыторыі аб'екта праходзіла мяжа паміж Заходняй і Усходняй Беларуссю. Тагачасную атмасферу найлепшым чынам перадае ваенна-гістарычны комплекс «Мінскі ўмацавальны раён». Ёсць тут і пагранічная застава, і мытня, і цягнікі — савецкі і нямецкі, якія перасякаюць мяжу. Адноўлены таксама акопы часоў Вялікай Айчыннай вайны, лінія абароны, дзоты. На спецыяльнай пляцоўцы — тэхніка і ўзбраенне: легендарныя «Кацюшы», гаўбіцы, танкі. Паводле ўспамінаў партызан-ветэранаў створаны зямлянкі — штабная і камандзірская, і нават майстэрня па рамонце зброі і лазня. Комплекс выклікае непадробную цікавасць у наведвальнікаў, а маладажоны пасля роспісу прыязджаюць сюды ўскласці кветкі...

Падсілкавацца наведвальнікі могуць у палатцы, разлічанай на 130 чалавек, але ў куткім часе адчыніць дзверы рэстаран на 100 месцаў. А вось жыць можна ў індывідуальных доміках, выкананых у нацыянальным стылі ды з айчынных матэрыялаў.

Са свайго боку заўважу: асаблівасць праекта ў тым, што яго арганізатары ўмела спалучаюць прыродныя багацці Беларусі і культурную, гістарычную спадчыну тутэйшых мясцін. І на гэтай аснове ствараюць не проста забаўляльны комплекс, а сапраўдны цэнтр патрыятычнага, гістарычнага, экалагічнага выхавання.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,

Дзяржынскі раён.

У ЕЎРАСАЮЗ БЕЗ ВІЗЫ

Як вядома, з 1 лютага 2012 года жыхары беларускага памежжа атрымалі магчымасць наведваць прыгранічныя тэрыторыі Латвіі ў спрошчаным парадку — без візы, па спецыяльным дазволе. Тэрмін дзеяння апошняга — ад аднаго года да пяці. Кошт — усяго 20 еўра.

Такім чынам, нашым землякам з памежжа стала прасцей і танней цяпер трапіць у Еўрасаюз, але на тэрыторыю не далей чым 30-50 кіламетраў. Каб скарыстацца магчымасцю на льготных умовах адправіцца за мяжу, трэба жыць на памежнай тэрыторыі не менш за год...

Толькі ў красавіку грамадзянам Латвіі былі выдадзены 4410 дазволаў. Цікава, што адмовілі толькі траім. Каля 70 працэнтаў грамадзян Латвіі наведваюць сваіх сваякоў у Беларусі. Некаторыя спецыяльна прыязджаюць, каб скарыстацца паслугамі беларускіх медыцынскіх устаноў і санаторыяў.

Што датычыцца колькасці жыхароў памежжа, якія маюць права перасякаць мяжу без візы, па апошняй ацэначнай інфармацыі гэта прыкладна 5 тысяч грамадзян Латвіі і каля тысячы жыхароў Віцебшчыны. З беларускага боку, дарэчы, на прыгранічных тэрыторыях размяшчаюцца Браслаў, Верхнядзвінск, Мёры, пасёлак Відзы...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СТУДЭНТЫ БЯРУЦЦА ЗА РЫДЛЁЎКІ

У Магілёўскай вобласці створана больш за дзве сотні студэнцкіх працоўных атрадаў.

Большую частку маладой працоўнай сілы (а гэта 4,5 тысячы чалавек) мяркуецца прыцягнуць да сельскагаспадарчых работ і добраўпарадкавання. Вялікі «кавалак» працы для студатрадаў — Горкі, якія рыхтуюцца да «Дажынак-2012». Там будуць працаваць больш за тысячу чалавек. Асаблівая ўвага будзе нададзена і актуальнаму на вёсцы будаўніцтву малочнатаварных фермаў. Улады абяцаюць, што забяспечаць студэнтаў і навучэнцаў належнымі ўмовамі працы і пражывання, а таксама дастойнымі заробкамі. Маладым людзям мяркуюць плаціць не меней за 3 мільёны рублёў, але, натуральна, пры ўмове выканання нормаў.

Ілона ІВАНОВА.

ЗАХАПЛЕННЕ КІТАЙСКАЙ МОВАЙ АДКРЫВАЕ ПЕРСПЕКТЫВЫ...

Студэнтка філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ірына Несцерава і студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Алеся Казімірава прадставяць Беларусь у фінале Міжнароднага конкурсу студэнтаў па кітайскай мове «Кітайская мова — мост». Гэта міжнародны праект, удзел у якім штогод бяруць студэнты больш чым з 50 краін. Ён праводзіцца з мэтай папулярызацыі кітайскай мовы, прадастаўлення студэнтам, якія займаюцца вывучэннем кітайскай мовы, магчымасці наладзіць кантакты і паглыбіць свае веды ў галіне кітайскай лінгвістыкі і культуры. Усяго ў адборачным туры ўзялі ўдзел 11 студэнтаў сталічных ВНУ. Маладыя людзі спаборнічалі ў вусным выступленні, адказвалі на пытанні па краіназнаўстве, а таксама дэманстравалі свае музычныя і танцавальныя здольнасці. Фінал міжнароднага конкурсу студэнтаў па кітайскай мове пройдзе ў Пекіне летам.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЛАКАМАТЫЎ ЗАЧАПІЎ ЗА РУКУ

Мужчына, бадай, толькі цудам застаўся жывы пасля таго, як яго за руку «зачапіў» лакаматыў грузавога цягніка.

Інцыдэнт адбыўся вечарам каля станцыі Слаўнае Аршанскага раёна. Цягнік ехаў з Оршы ў Мінск. 33-гадовы мужчына, ігнаруючы нормы бяспекі, пачаў перабягаць перад цягніком чыгуначныя пуці ў неўсталяваным месцы. Ды не паспеў дабегчы ў бяспечнае месца, як лакаматыў зачапіў яго за руку. Ад удару мужчыну адкінула ўбок, у выніку чаго пры падзенні ён атрымаў траўмы. Затрымка ў руху цягніка склала дзесяць хвілін. «Подзвіг» на рэйках пацярпелы ўчыніў у нецвярозым стане.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

А Ў БАГАЖНІКУ — РЫБЫ І РАКАЎ НА 77,5 МІЛЬЁНА РУБЛЁЎ

У такую суму — 774 базавыя велічыні, або амаль 77,5 мільёна рублёў — ацэнена шкода прыродным рэсурсам, якую нанеслі ім два браканьеры.

Як расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, работнікі Лепельскай міжрайінспекцыі пры ўдзеле супрацоўнікаў Ушацкага ДАІ, правяраючы ў адной з вёсак легкавы аўтамабіль, знайшлі ў яго багажніку буйны ўлоў — 13 асобін розных відаў рыб і 472 (!) асобіны вузкапалага рака. Здабычу, вядома, канфіскавалі. Гэтак жа, як і рыштунак для падводнага палявання: падводную стрэльбу, гідракасцюм, ласты, маску, дыхальную трубку. Па матэрыялах праверкі вынікае, што затрыманыя — непрацуючыя грамадзяне 1965 і 1966 гадоў нараджэння — з выкарыстаннем вышэйпералічанага арсенала здабылі рыбу і ракаў на возеры Бельскае ва Ушацкім раёне. Вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці названых грамадзян.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Шчаслівага шляху!

НОВЫЯ ДАРОГІ, СУЧАСНАЯ ТЭХНІКА

У Магілёўскай вобласці 1 чэрвеня адкрыўся для руху транспарту новы ўчастак аўтатрасы М-4 Мінск — Магілёў. Ва ўрачыстасці бралі ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл Русы і старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.

Дарожныя будаўнікі абяцаюць камфортныя паездкі са сталіцы ў абласны цэнтр і назад: траса, дзе цяпер завяршаецца рэканструкцыя, мае сучаснае якаснае дарожнае пакрыццё. Яно зроблена з выкарыстаннем новых тэхналогій і мае гарантыю на 10 гадоў. Цяпер гэтая дарога мае дзве паласы ў адным кірунку, новыя развязкі і масты.

Адкрыты цяпер участак пайшоў у аб'езд раённага цэнтра Бялынічы. Увогуле работы на М-4 пачаліся яшчэ ў 2009 годзе, а завяршыць іх плануецца сёлета да 1 верасня, каб рэгіён дастойна сустракаў гасцей «Дажынак-2012». Такія планы цалкам рэальныя: на тэрыторыі Магілёўскай вобласці дарожнікам засталося «прайсці» каля двух дзясяткаў кіламетраў. Пасля завяршэння рэканструкцыі траса Мінск — Магілёў атрымае новую, першую катэгорыю.

У гэты ж дзень Міхаіл Русы і Пётр Руднік перадалі гаспадаркам Магілёўскай вобласці 11 кормаўборачных камбайнаў беларускай вытворчасці. Па традыцыі, якая склалася ў рэгіёне, першымі ключы ад новых камбайнаў з рук кіраўніцтва атрымалі жанчыны, якія стаяць на чале гаспадарак. Тэхніка, якая прыходзіць згодна з Прэзідэнцкай праграмай мадэрнізацыі айчыннай сельскай гаспадаркі, стане добрай дапамогай аграрыям.

Ілона ІВАНОВА

АЎТОБУСАМ — ДА СІМФЕРОПАЛЯ

З 12 чэрвеня аднаўляецца праца аўтобусаў па міжнародным маршруце Мінск — Друскінінкай.

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», адпраўляцца яны будуць з Мінска ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 0.20 (з Друскінінкая — у 17.00) па серадах і нядзелях. Рэйсы будуць выконвацца на аўтобусах маркі «МАЗ-152», «МАЗ-251», «Сетра-215», «Сетра-315».

Таксама з 16 чэрвеня адкрываецца рух аўтобусаў па маршруце Мінск — Сімферопаль. Гаворка пра рэйс адпраўленнем з Мінска ад аўтавакзала «Цэнтральны» ў 19.30 па суботах (з Сімферопаля ў 8.55 па панядзелках).

Сяргей РАСОЛЬКА.

РАСКЛАД РУХУ ПАСАЖЫРСКІХ ЦЯГНІКОЎ ПА СТАНЦЫІ МІНСК—ПАСАЖЫРСКІ ТРАНСПАРТНАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА ЎНІТАРНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «МІНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНКІ» 2012—2013 ГОДА

№ катэгорыя цягніка	маршрут руху	час адпраўл. з пачатковай станцыі	па станцыі Мінск–Пасажырскі: час прыбыцця	стаянка	час адпраўлення	час: прыбыццё на канц. станцыю	у дарозе	Дні абарачэння
НА МАСКВУ, НОВАСІБІРСК								
12 хуткі	Мінск–Масква	-	-	-	0.13	10.33	9.20	Па нядзелях
10 хуткі	Варшава–Масква	15.15	1.56	0.12	2.08	11.45	8.37	штодня
148 хуткі	Калінінград–Масква	16.37	2.56	0.22	3.18	15.21	10.50	па няцотных, з 24/6 па 1/9 штодня
196 хуткі	Брэст–Масква	21.40	3.21	0.19	3.40	16.23	11.43	штодня
146 хуткі	Брэст–Камунары	20.30	6.09	0.13	6.22	12.51	6.29	па няцотных
812	Мінск–Орша	-	-	-	7.37	9.56	2.19	штодня
132 хуткі	Брэст–Масква	4.29	8.42	0.17	8.59	20.21	10.22	штодня
70 хуткі	Берлін–Саратаў	17.24 з 4/10 16.22	12.12	0.17	12.29	17.02	27.33	па нядзелях
18 хуткі	Ніца–Масква	19.42	12.12	0.17	12.29	22.15	8.46	па панядзелках
24 хуткі	Парыж–Масква	8.28	14.36	0.18	14.54	23.58	8.04	серада, чацвер, нядзеля з 30/5 па 6/10 аўторак, серада, чацвер, пятніца, нядзеля
814	Мінск–Орша	-	-	-	15.21	17.40	2.19	штодня
134 хуткі	Мінск–Архангельск	-	-	-	15.32	1.00	32.28	па серадах
104 хуткі	Брэст–Новасібірск	10.48	15.14	0.18	15.32	8.48	64.16	аўторак
114 хуткі	Брэст–Новасібірск	10.48	15.14	0.18	15.32	8.48	64.16	субота
64 хуткі	Мінск–Іркуцк	-	-	-	15.32	14.56	94.24	чацвер, нядзеля
26 хуткі	Мінск–Масква	-	-	-	18.26	5.56	10.30	штодня
318 пасаж	Брэст–Караганды (праз Смаленск)	13.55	19.29	0.25	19.54	9.50	82.56	пятніца
364 пасаж	Мінск–Алматы (праз Смаленск)	-	-	-	19.54	4.03	101.09	нядзеля
426 пасаж	Калінінград–Чалябінск	8.58	19.32	0.22	19.54	6.00	57.06	па датах па 22/9
2 хуткі	Мінск–Масква	-	-	-	21.30	8.05	9.35	штодня
4 хуткі	Мінск–Масква	-	-	-	21.45	6.44	7.59	па няцотных
8 хуткі	Брэст–Масква	17.40	21.19	0.26	21.45	6.44	7.59	па цотных
6 хуткі	Вільнюс–Масква	16.55	21.39	0.30	22.09	8.58	9.49	штодня
28 хуткі	Брэст–Масква	17.50	22.04	0.14	22.18	9.20	10.02	штодня
30 хуткі	Калінінград–Масква	11.48	22.02	0.36	22.38	9.27	9.49	па няцотных, з 2/7 па 30/8 штодня
392 пасаж	Гродна–Унеча	16.00	22.39	0.28	23.07	11.00	10.53	па няцотных
22 хуткі	Прага–Масква	21.54	23.11	0.27	23.38	9.37	8.59	штодня
78 хуткі	Гродна–Масква	17.10	23.18	0.27	23.45	10.26	9.41	штодня
НА С.-ПЕЦЯРБУРГ, ПОЛАЦК, ВІЦЕБСК								
58 хуткі	Гродна–С.-Пецярбург	17.36	0.40	0.20	1.00	16.40	14.40	з 28/5 па 14/9 па цотных; з 16/9 па 8/4 панядзелак, нядзеля; з 10/4 па 26/5 панядзелак, серада, нядзеля
248 хуткі	Львоў–С.-Пецярбург	12.33	0.40	0.20	1.00	16.40	15.40	па датах
142 хуткі	Брэст–Віцебск	20.30	6.09	0.13	6.22	10.55	4.33	па цотных
66 хуткі	Мінск–Мурманск	-	-	-	8.32	6.17	44.45	па цотных
36 хуткі	Брэст–С.-Пецярбург	7.18	11.44	0.19	12.03	4.35	15.32	з 29/5 па 4/9 аўторак, нядзеля; з 6/9 па 26/5 чацвер, нядзеля
118 хуткі	Мінск–Віцебск	-	-	-	16.50	21.03	4.13	штодня, акрамя серады
625 пасаж	Мінск–Полацк	-	-	-	17.12	23.00	5.48	штодня
52 хуткі	Мінск–С.-Пецярбург	-	-	-	17.41	8.44	14.03	штодня
50 хуткі	Брэст–С.-Пецярбург	14.05	18.28	0.20	18.48	9.39	13.51	штодня
624 пасаж	Гродна–Віцебск	16.00	22.39	0.28	23.07	4.51	5.44	па цотных
612 пасаж	Баранавічы–Віцебск–Полацк	21.18	23.32	0.21	23.53	5.41 8.30	5.48 8.37	штодня
НА КАЛІНІНГРАД, РЫГУ, ВІЛЬНЮС								
5 хуткі	Масква–Вільнюс	18.55	3.06	0.27	3.33	8.00	4.27	штодня
425 пасаж	Чалябінск-Калінінград	20.05	4.01	0.28	4.29	16.32	11.03	па датах па 28/9
147 хуткі	Масква–Калінінград	20.10	5.16	0.26	5.42	18.42	12.00	па цотных, з 24/6 па 1/9 штодня
15 хуткі	Мінск–Вільнюс	-	-	-	7.45	10.45	3.00	штодня
37 хуткі	Мінск–Вільнюс	-	-	-	18.50	21.50	3.00	штодня
359 пасаж	Адлер–Калінінград	14.25	18.38	0.23	19.01	7.37	11.36	па датах
87 пасаж	Мінск–Рыга	-	-	-	21.28	9.35	12.07	штодня
29 хуткі	Масква–Калінінград	13.54	23.29	0.23	23.52	12.01	11.09	па цотных, з 3/7 па 31/8 штодня
НА ГОМЕЛЬ, КІЕЎ, АДЛЕР, СІМФЕРОПАЛЬ								
630 пасаж	Мінск–Гомель	-	-	-	0.10	5.27	5.17	з 10/9 панядзелак, пятніца, субота, нядзеля
330 пасаж	Баранавічы–Жытомір	22.20	0.22	0.22	0.44	12.43	11.59	панядзелак, пятніца, субота, нядзеля
640 пасаж	Баранавічы–Калінкавічы	22.20	0.22	0.22	0.44	6.27	5.43	аўторак, серада, чацвер
140 хуткі	Мінск–Сімферопаль	-	-	-	0.59	5.08	28.09	па цотных з 18/6 па 20/9
68 хуткі	Брэст–Валгаград	20.59	1.01	0.22	1.23	18.27	40.04	з 29/5 па 13/10 аўторак, чацвер, субота з 18/10 па 25/5 чацвер, субота
360 пасаж	Калінінград–Адлер	18.04	4.23	0.22	4.45	8.26	50.26	па датах
616 пасаж	Гродна–Гомель	23.23	7.24	0.15	7.39	12.24	4.45	штодня
100 хуткі	Мінск–Сімферопаль	-	-	-	9.00	10.33	25.33	па няцотных з 31/5 па 30/9 штодня
94 хуткі	Мінск–Адэса	-	-	-	12.39	10.50	22.11	па цотных з 11/6 па 30/9 штодня
96 хуткі	Мінск–Гомель	-	-	-	15.04	19.31	4.27	штодня, акрамя чацвярга
98 хуткі	Мінск–Гомель	-	-	-	15.04	19.31	4.27	чацвер
638 пасаж	Мінск–Калінкавічы–Гомель	-	-	-	15.12	20.23 23.14	5.11 8.02	з 7/9 па 24/5 па пятніцах
144 хуткі	Мінск–Магілёў	-	-	-	15.30	19.23	3.53	штодня
806 пасаж	Мінск–Калінкавічы–Гомель	-	-	-	16.29	21.05 23.22	4.36 6.53	штодня
108 хуткі	Мінск–Гомель–Калінкавічы	-	-	-	17.15	21.26 23.57	4.11 6.42	штодня
632 пасаж	Мінск–Гомель	-	-	-	18.15	23.06	4.51	з 7/9 па 24/5 пятніцах
302 пасаж	Мінск–Адлер	-	-	-	19.07	11.22	39.15	па цотных
356 пасаж	Мінск–Кіславодск	-	-	-	19.07	10.41	38.34	па 3,7,11,15,19,23,27,31 чыслах кожнага месяца
390 пасаж	Мінск–Анапа	-	-	-	19.07	11.05	38.58	па 1, 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29 чыслах кожнага месяца
110 хуткі	Брэст–Магілёў	14.35	18.50	0.30	19.20	22.57	3.37	штодня
486 пасаж	Мінск–Феадосія	-	-	-	20.10	3.05	30.55	з 15/6 па 29/6 па няцотных, з 1/7 па 17/9 штодня
86 хуткі	Мінск–Кіеў	-	-	-	21.25	8.36	11.11	штодня
494 пасаж	Мінск–Сімферопаль	-	-	-	22.12	5.20	31.08	з 14/6,16/6, 18/6, 20/6, 22/6
384 пасаж	Мінск–Марыупаль	-	-	-	23.04	2.44	27.40	па няцотных
136 хуткі	Мінск–Еўпаторыя	-	-	-	23.59	4.25	28.26	з 10/6 па 30/9 штодня
НА БРЭСТ, ГРОДНА, ЛЬВОЎ								
9 хуткі	Масква–Варшава	16.50	0.10	0.11	0.21	8.30	9.09	штодня
27 хуткі	Масква–Брэст	15.43	0.49	0.30	1.19	5.30	4.11	штодня
77 хуткі	Масква–Гродна	17.08	2.06	0.27	2.33	8.42	6.09	штодня
49 хуткі	С.-Пецярбург–Брэст	15.05	3.53	0.14	4.07	8.24	4.17	штодня
317 пасаж	Караганды–Брэст	20.40	4.01	0.16	4.17	9.18	5.01	субота
67 хуткі	Валгаград–Брэст	13.05	4.24	0.23	4.47	9.09	4.22	з 2/6 па 17/10 панядзелак, серада, субота; з 22/10 па 29/5 панядзелак, серада
611 пасаж	Віцебск–Баранавічы	22.24	4.43	0.22	5.05	7.18	2.13	штодня
329 пасаж	Жытомір–Баранавічы	16.30	5.17	0.22	5.39	7.53	2.14	панядзелак, аўторак, субота, нядзеля
639 пасаж	Калінкавічы–Баранавічы	22.22	5.17	0.22	5.39	7.53	2.14	серада, чацвер, пятніца
109 хуткі	Магілёў–Брэст	23.58	5.38	0.38	6.16	10.23	4.07	штодня
7 хуткі	Масква–Брэст	23.11	6.09	0.24	6.33	10.44	4.11	па цотных
195 хуткі	Масква–Брэст	19.39	6.34	0.14	6.48	12.32	5.44	штодня
819	Мінск–Баранавічы	-	-	-	8.25	9.57	1.32	штодня
21 хуткі	Масква–Прага	23.44	8.06	0.28	8.34	6.44	23.10	штодня
131 хуткі	Масква–Брэст	23.34	8.21	0.23	8.44	12.53	4.09	штодня
35 хуткі	С.-Пецярбург–Брэст	21.20	10.31	0.13	10.44	15.20	4.36	з 28/5 па 3/9 панядзелак, субота; з 5/9 па 25/5 серада, субота
803 пасаж	Мінск–Брэст	-	-	-	12.15	16.11	3.56	нядзеля
103 хуткі	Новасібірск–Брэст	22.09	11.46	0.29	12.15	16.30	4.15	панядзелак
113 хуткі	Новасібірск–Брэст	22.09	11.46	0.29	12.15	16.30	4.15	пятніца
57 хуткі	С.-Пецярбург–Гродна	22.42	12.15	0.19	12.34	19.11	6.37	з 29/5 па 15/9 па няцотных, з 17/9 па 9/4 панядзелак, аўторак; з 11/4 па 27/5 панядзелак, аўторак; чацвер
821	Мінск–Баранавічы	-	-	-	12.59	14.35	1.36	штодня
105 хуткі	Мінск–Брэст	-	-	-	13.35	18.01	4.26	штодня
69 хуткі	Саратаў–Берлін	12.58	15.06	0.22	15.28	8.51	18.23	пятніца
23 хуткі	Масква–Парыж	8.00	15.06	0.22	15.28	20.31	30.03	Панядзелак, чацвер, нядзеля з 28/5 па 4/10 панядзелак, аўторак, чацвер, субота, нядзеля
247 хуткі	С.-Пецярбург–Львоў	1.00	15.19	0.32	15.51	4.48	12.57	па датах
137 хуткі	Мінск–Гродна	-	-	-	16.24	22.08	5.44	штодня
111 хуткі	Мінск–Брэст	-	-	-	17.28	21.42	4.14	штодня
635 пасаж	Мінск–Пінск	-	-	-	17.38	22.57	5.19	з 7/9 па 24/5 па пятніцах
371 пасаж	Мінск–Чарнаўцы	-	-	-	17.38	11.27	17.49	па цотных
823	Мінск–Баранавічы	-	-	-	18.06	19.41	1.35	штодня
101 хуткі	Мінск–Варна	-	-	-	18.29	9.50	39.21	з 6/6 па 5/9 па серадах
801 пасаж	Мінск–Брэст	-	-	-	18.29	23.20	4.51	пятніца
17 хуткі	Масква–Ніца	11.33	19.18	0.17	19.35	12.28	41.53	чацвер
115 хуткі	Мінск–Варшава	-	-	-	20.44	5.40	9.56	штодня
825	Мінск–Баранавічы	-	-	-	22.05	23.40	1.35	штодня
145 хуткі	Камунары–Брэст	16.03	22.30	0.22	22.52	8.45	9.53	па няцотных
141 хуткі	Віцебск–Брэст	17.59	22.30	0.22	22.52	8.45	9.53	па цотных
391 пасаж	Унеча–Гродна	12.50	22.57	0.23	23.20	5.25	6.05	па цотных
623 пасаж	Віцебск–Гродна	18.16	22.57	0.23	23.20	5.25	6.05	па няцотных
615 пасаж	Гомель–Гродна	18.28	23.10	0.23	23.33	7.17	7.44	штодня

ПРЫБЫЦЦЁ ЦЯГНІКОЎ МЯСЦОВАГА ФАРМІРАВАННЯ

№ катэгорыя цягніка	Маршрут руху	Час адпраўлення з пачатковай станцыі	Час прыбыцця ў Мінск	Дні абарачэння
363 пасаж	Алматы–Мінск	21.45	4.01	серада
637 пасаж	Гомель–Мінск	23.59	5.28	з 8/9 па 25/5 па суботах
11 хуткі	Масква–Мінск	21.09	5.32	субота
107 хуткі	Гомель-Калінкавічы-Мінск	21.56	5.46	штодня
631 пасаж	Гомель–Мінск	0.36	5.54	з 8/9 па 25/5 па суботах
3 хуткі	Масква–Мінск	23.11	6.09	па няцотных
626 пасаж	Полацк–Мінск	0.17	6.15	штодня
301 пасаж	Адлер–Мінск	16.21	6.36	па цотных
355 пасаж	Кіславодск–Мінск	16.53	6.36	па 4, 7,11,15, 19, 23, 27, 31(1) чыслах кожнага месяца
389 пасаж	Анапа–Мінск	17.30	6.36	па 2, (3), 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29 чыслах кожнага месяца
88 пасаж	Рыга–Мінск	18.30	6.45	штодня
1 хуткі	Масква–Мінск	22.25	7.28	штодня
608 пасаж	Брэст–Лунінец–Мінск	23.41	7.53	з 3/9 па 20/5 панядзелак
51 хуткі	С.-Пецярбург–Мінск	19.08	7.58	штодня
116 хуткі	Варшава–Мінск	20.52	8.02	штодня
820	Баранавічы–Мінск	6.37	8.12	штодня
85 хуткі	Кіеў–Мінск	21.56	8.35	штодня
372 пасаж	Чарнаўцы–Мінск	13.53	9.00	па цотных
139 хуткі	Сімферопаль–Мінск	7.55	9.54	з 20/6 па 22/9 па цотных
38 хуткі	Вільнюс–Мінск	7.05	10.05	штодня
802 пасаж	Брэст–Мінск	5.49	10.24	субота
102 хуткі	Варна–Мінск	20.20	10.24	з 10/6 па 9/9 нядзеля
106 хуткі	Брэст–Мінск	6.20	10.33	штодня
135 хуткі	Еўпаторыя–Мінск	7.10	10.36	з 13/6 па 3/10 штодня
95 хуткі	Гомель–Мінск	6.42	10.44	штодня, акрамя чацвярга
97 хуткі	Гомель–Мінск	6.42	10.44	чацвер
117 хуткі	Віцебск–Мінск	6.40	10.50	штодня, акрамя серады
143 хуткі	Магілёў–Мінск	7.27	10.56	штодня
805 пасаж	Гомель–Калінкавічы–Мінск	4.35	11.34	штодня
63 хуткі	Іркуцк–Мінск	14.10	11.46	аўторак, субота
133 хуткі	Архангельск–Мінск	5.02	11.46	нядзеля
822	Баранавічы–Мінск	10.23	11.58	штодня
138 хуткі	Гродна–Мінск	6.30	12.16	штодня
811	Орша–Мінск	10.10	12.28	штодня
636 пасаж	Пінск–Мінск	6.57	12.32	з 8/9 па 25/5 па суботах
93 хуткі	Адэса–Мінск	14.08	12.53	з 13/6 штодня, с 4/10 па цотных
65 хуткі	Мурманск–Мінск	19.50	14.52	па цотных
99 хуткі	Сімферопаль–Мінск	13.03	15.55	па няцотных, з 2/6 па 2/10 штодня
112 хуткі	Брэст–Мінск	11.58	16.43	штодня
493 пасаж	Сімферопаль–Мінск	9.30	16.47	з 17/6 па 25/9 па няцотных
824	Баранавічы–Мінск	15.35	17.10	штодня
485 пасаж	Феадосія–Мінск	9.32	18.13	з 18/6 па 2/7 па цотных, з 4/7 па 20/9 штодня
25 хуткі	Масква–Мінск	9.51	19.52	штодня
383 пасаж	Марыупаль–Мінск	16.53	20.35	па цотных
804 пасаж	Брэст–Мінск	16.49	20.43	нядзеля
813	Орша–Мінск	18.46	21.04	штодня
826	Баранавічы–Мінск	20.09	21.44	штодня
629 пасаж	Гомель–Мінск	17.00	21.50	з 9/9 чацвер, пятніца, субота, нядзеля
16 хуткі	Вільнюс–Мінск	19.10	22.10	штодня

БЕСПЕРАСАДАЧНЫЯ ВАГОНЫ

Станцыя прызначэння	№ цягніка	Час адпраўлення	Станцыя і час перапрычэпкі: прыбыццё		адпраўленне	Час: прыб. на кан.ст.	у шляху	Дні абарачэння	Прыбыццё назад у Мінск: № цягніка	Час прыб.	Дні прыбыцця
Мінск–Кішынёў	330 640	0.44	4.27	Жлобін	7.09	6.12	29.28	па няцотных	615	23.10	па няцотных
Мінск–Сафія	68	1.23	6.16	Гомель	8.00	9.25	56.02	субота	615	23.10	серада
Мінск–Амстэрдам	21	8.34	-	-	-	9.59	26.25	аўторак, чацвер, нядзеля	22	23.11	аўторак, чацвер, субота
Мінск–Базель	21	8.34	-	-	-	10.37	27.03	штодня	22	23.11	штодня
Мінск–Прага	21	8.34	-	-	-	6.44	23.10	панядзелак, серада, субота	22	23.11	панядзелак, серада, пятніца
Мінск–Вена	21	8.34	-	-	-	6.22	22.48	пятніца	22	23.11	нядзеля
Мінск–Друя	625	17.12	20.47	Круляўшчызна	2.46	6.40	13.30	пятніца, субота	626	6.15	нядзеля, панядзелак
Мінск–Пскоў	52	17.41	4.49	Дно	5.37	7.30	12.49	панядзелак, чацвер	51	7.58	панядзелак, чацвер
Мінск–Канстанца	101	18.29	-	-	-	3.19	32.50	серада па 5/9	102	10.24	нядзеля па 9/9
Мінск–Сімферопаль	86	21.25	1.31	Гомель	3.29	5.20	31.55	па 5, 9, 13, 17, 21, 25, 29 чыслах	383	20.35	па 8, 12, 16, 20, 24, 28 чыслах

■ Мова — душа народа

Алесь БЕЛЬСКІ, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская мова і літаратура»:

«НАШ ЧАСОПІС — ЯК МАЛАДЫ АРГАНІЗМ: РАЗВІВАЕЦЦА І СТАЛЕЕ»

Калі Алесь Бельскі вучыўся ў школе, яго мама часта ставіла яму ў прыклад іх зямлячку — вядомую журналістку Марыю Карпенка, галоўнага рэдактара часопіса «Работніца і сялянка»: «Паглядзі, кім стала звычайная вясковая дзяўчынка...»

Вось і Алесь яшчэ з юнацтва спрабаваў сябе ў журналістыцы. Друкавацца пачаў ужо з 12 гадоў. Таму пасля заканчэння школы іншага пытання нават не стаяла — толькі журфак! Паступаць юнак паехаў з тоўстай папкай, у якой было сабрана больш за сотню (!) аўтарскіх публікацый...

Аднак мара не спраўдзілася. Алесь падаўся працаваць у школу. Менавіта вопыт настаўніцтва, як прызнаецца ён сам, і прадвызначыў яго далейшы лёс. Затым была вучоба на «беларускай філалогіі», аспірантура, абарона дысертацыі, выкладчыцкая праца...

Сёння прафесар Алесь Бельскі — галоўны рэдактар часопіса «Беларуская мова і літаратура».

— Алесь Іванавіч, на пасадзе галоўнага рэдактара часопіса «Беларуская мова і літаратура» вы ўжо каля дзесяці гадоў...

— Дванаццаць гадоў таму мяне запрасілі працаваць загадчыкам лабараторыі літаратурнай адукацыі ў Нацыянальны інстытут адукацыі. Там я зблізіўся з вядомым вучоным, прафесарам Васілём Протчанкам. Ён — першы галоўны рэдактар часопіса «Беларуская мова і літаратура ў школе» — і перадаў, як жартам сказаў, свой «скарб» мне «ў спадчыну».

Многа ці мала — дзесяць гадоў рэдактарства? Па-ранейшаму адчуваю абавязак і адказнасць перад нашымі беларускімі філолагамі — імкнуцца рабіць усё, што ад мяне залежыць, каб дапамагаць ім у штодзённай нялёгкай працы. Асабліва такая падтрымка — інфармацыйная і педагагічная — патрэбна маладым настаўнікам.

— Ці не ўзнікала калі-небудзь жаданне зноў вярнуцца ў школу настаўнічаць?

— Па вялікім рахунку, школу я ніколі і не пакідаў, заўсёды быў далучаны да яе. Пэўны час настаўнічаў, папрацаваў нават крыху «начальнікам» — быў намеснікам дырэктара школы ў Мінскім раёне. Амаль чатыры гады загадваў кафедрай даўніверсітэцкай падрыхтоўкі БДУ. Нямала часу аддаў працы і ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, там меў непасрэднае дачыненне да распрацоўкі важных дакументаў у галіне літаратурнай адукацыі ў сярэдняй школе: канцэпцый, стандартаў, праграм і да т. п.

З сённяшнімі настаўнікамі даволі часта сустракаюся. І не толькі як галоўны рэдактар часопіса, але, напрыклад, і як адзін з аўтараў школьнага падручніка для 6 класа ці дапаможнікаў для старшакласнікаў. Меркаванні настаўнікаў — самы дакладны «барометр» у ацэнцы таго, што ты робіш і чым займаешся.

— Якія тэмы ў часопісе «Беларуская мова і літаратура» асвятляюцца найбольш часта?

— У часопісе існуюць традыцыйныя рубрыкі, напрыклад, «Запрашаем на ўрок» ці «Пазакласная работа». Метадычныя распрацоўкі і практычныя матэрыялы, змешчаныя ў гэтых рубрыках, запатрабаваныя ў першую чаргу.

На пэўным этапе мы вырашылі, што наш часопіс, апрача іншага, павінен быць і прафесійнай трыбунай, з якой настаўнік можа выказаць свае думкі і погляды на метадычныя праблемы і складанасці ў моўнай і літаратурнай адукацыі, выказаць крытычныя заўвагі пра падручнікі, праграмы і г. д. З гэтай мэтай запачаткавалі рубрыку «Абмен думкамі». Вялікім, проста фенаменальным поспехам у 2008—2011 гадах карысталіся матэрыялы «круглага стала» на тэму: «Адукацыйныя тэхналогіі ў сучаснай школе: тэорыя, практыка, праблемы».

У рэдакцыйную калегію ўваходзяць вядомыя метадысты, выдатныя вучоныя-філолагі, таленавітыя настаўнікі. У кожным з рэгіёнаў у нас ёсць свае прадстаўнікі — члены рэдкалегіі. Як правіла, кожны з іх працуе ў вядучым рэгіянальным універсітэце, мае аўтарытэт у сваёй прафесійнай галіне. Васіль Рагаўцоў з Магілёва, Алена Руцкая з Гродна, Іван Штэйнер з Гомеля, Надзея Віслабокава з Віцебска і інш.

— Якім вы бачыце свайго падпісчыка — так бы мовіць, партрэт сярэднестатыстычнага чытача?

— Як правіла, гэта вясковы настаўнік і педагог з райцэнтра. Кожны з іх неабыякавы да сваёй працы, творчы і няўрымслівы чалавек, які пастаянна імкнецца да прафесійнага самаўдасканалення.

Крыху больш інертныя сярод падпісчыкаў — сталічныя настаўнікі. Чаму? У іх не існуе праблем з набыццём метадычнай літаратуры, паколькі ў Мінску хапае кніжных крам, яны тут пад бокам. Да таго ж пры жаданні можна проста паехаць у бібліятэку і зрабіць ксеракопію патрэбных матэрыялаў. Неаднойчы назіраў, як настаўнікі замаўляюць ксеракапіраванне старонак нашага часопіса. Што і казаць, прыемна. Але лепш за ўсё, каб наш часопіс выпісвала кожная школа і ён быў у кабінеце настаўніка беларускай мовы і літаратуры пад рукой.

— Як вы лічыце, у чым прынцыповае адрозненне часопісаў «Беларуская мова і літаратура» і «Роднае слова»?

— Кожны, хто добра ведае і адзін часопіс, і другі, з лёгкасцю адкажа на пытанне. Часопіс «Беларуская мова і літаратура» арыентаваны на практыку, асноўная яго функцыя — забеспячэнне вучэбнага і выхаваўчага працэсу ў школе дыдактычнымі матэрыяламі.

Часопіс «Роднае слова» — наш першы і старэйшы філалагічны часопіс з культуралагічнай накіраванасцю. Ён забяспечвае інтэграцыю філалогіі з мастацтвам і культурай, прытым у самым шырокім кантэксце — як нацыянальным, так і сусветным.

Нашы часопісы, вобразна кажучы, — два бакі аднаго медаля. Дапаўняючы адзін аднаго, яны супольна працуюць на карысць беларускай школы і нацыянальнай культуры.

Мы дбаем пра адну агульную справу — дапамагаць настаўнікам у прафесійным станаўленні і ўдасканаленні.

— Якімі новымі рубрыкамі і новаўвядзеннямі парадуе часопіс сёлета?

— Новыя рубрыкі з'яўляюцца пастаянна. «Рыхтуемся да тэсціравання», «Беларускі правапіс: вывучаем разам». Толькі за апошнія два гады часопіс пабагацеў амаль на дзясятак рубрык. Ужо па назвах няцяжка здагадацца, якога кшталту і зместу матэрыялы ў іх друкуюцца: «Асоба педагога», «Настаўнік і адораныя вучні», «У дапамогу маладому настаўніку», «Факультатыўныя заняткі», «Маніторынг якасці падручнікаў», «Гутаркі з пісьменнікамі» і шэраг іншых.

Сёлета заканчваем значны творчы праект «Літаратурны Мінск» — на трэцяй старонцы вокладкі друкуем каляровыя фотаздымкі літаратурных мясцін беларускай сталіцы. Наш часопіс (а ён выходзіць 17-ы год) — як малады арганізм: развіваецца, сталее, набывае новыя абрысы, каштоўны вопыт.

Ілья ЛАПАТО

■ Далёкае — блізкае

Першыя Шчорсаўскія чытанні

У Год кнігі ў гістарычным мястэчку Шчорсы стартаваў новы бібліятэчны праект. Першыя Шчорсаўскія чытанні арганізаваны Навагрудскім райвыканкамам, Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкай імя Я.Ф. Карскага, кафедрай гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы і Навагрудскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Тэма — «Развіццё бібліятэчнай справы на Гродзеншчыне: дзяржаўныя і прыватныя кнігазборы».

Гістарычнай падзеяй для ўсёй Беларусі назваў гэтыя чытанні сталічны прафесар Энгельс Дарашэвіч. І сапраўды, Гарадзеншчына, Навагрудчына былі буйнейшымі і значнымі цэнтрамі развіцця бібліятэчнай справы, якая мае на беларускіх землях 800-гадовую гісторыю. Першыя бібліятэкі ўзнікаюць яшчэ ў часы Гарадзенскага княства. І менавіта ў Гродне былі заснаваны і першая навуковая медыцынская бібліятэка (1775), і першая публічная бібліятэка (1830).

Славіліся ў Еўропе і магнацкія бібліятэкі з Гарадзеншчыны. Буйнейшыя сярод іх — бібліятэкі Храптовічаў і Сапегаў. Прыватны кнігазбор Сапегаў быў другім па велічыні на Беларусі (пасля бібліятэкі Радзівілаў). Стваральнікамі гэтых бібліятэк былі першыя асобы ў Вялікім Княстве Літоўскім: канцлер ВКЛ Леў Сапега, дзяржаўны, гаспадарчы, навуковы і культурны дзеяч ВКЛ Яўхім Храптовіч.

Таму нядзіўна, што мэта першых Шчорсаўскіх чытанняў, у якіх удзельнічалі навукоўцы, краязнаўцы, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк з Беларусі і Польшчы, — асэнсаваць значэнне і вартасць гістарычных кнігазбораў Навагрудчыны і ў цэлым Гродзеншчыны, выявіць асаблівасці іх фарміравання, захавання і даследавання ў кантэксце кніжнай культуры і, несумненна, ушанаваць найбагацейшую бібліятэку Храптовічаў. Таксама на чытаннях вырашана хадайнічаць перад мясцовымі ўладамі аб наданні імя Яўхіма Храптовіча Навагрудскай цэнтральнай раённай бібліятэцы.

Шчорсаўскія чытанні мяркуецца зрабіць традыцыйнымі і праводзіць раз на два гады. Тэма наступных чытанняў — манастырскія і царкоўныя бібліятэкі на Гродзеншчыне.

Любоў ТУРМАСАВА, загадчык аддзела краязнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага

Захоплены словам

Апантаны літаратуразнаўца, прафесар Вячаслаў РАГОЙША 5 чэрвеня адзначае 70-годдзе.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ён беларускім словам жыве: кіруе кафедрай тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. А таксама тады, калі даследуе творчасць тых, хто пісаў па-беларуску: Максіма Танка, Янкі Купалы, Якуба Коласа... і распавядае пра гэта іншым. Распавядае ва ўніверсітэце. Распавядае і праз свае публікацыі — даследчыцкія, манаграфічныя працы, якія папулярызуюць беларускую літаратуру, робяць яе больш зразумелай чытачу. Праз уласныя кнігі, якія стварае таму, што словы ідуць ад душы — напрыклад, у вершах. Як жа без іх можна абыходзіцца, калі беларускае слова становіцца сутнасцю жыцця?

І няма чаго здзіўляцца: натуральны шлях чалавека, які з беларускім словам з дзяцінства, з бацькоўскай сям'і. З беларускага Ракава. А побач Мінск, куды можна было паехаць вучыцца. Ён так і зрабіў — паступіў у БДУ на спецыяльнасць «Беларуская мова і літаратура». Спецыяльнасць вельмі ўдзячная і перспектыўная: ёсць што ў нас вывучаць, як і ёсць магчымасць сказаць сваё слова ў філалагічнай навуцы. Прынамсі, Вячаслаў Пятровіч праз свае даследаванні па гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры стаў доктарам філалагічных навук, прафесарам. Акрамя выкладчыцкай і навуковай дзейнасці, Вячаслаў Рагойша займаецца і перакладамі на беларускую мову — твораў М. Кацюбінскага, А. Ганчара, У. Яварыўскага і іншых пісьменнікаў.

Але сёння ў яго яшчэ адна вельмі важная справа: Вячаслаў Пятровіч з'яўляецца старшынёй Міжнароднага фонду Янкі Купалы. Дзякуючы яго руплівай працы з рукапіснай спадчынай Купалы мы атрымалі творы Песняра, пра якія раней не ведалі. Год юбілею класікаў беларускай літаратуры для прафесара Рагойшы павінен быць асабліва плённым. У нашых чытачоў будзе магчымасць у гэтым пераканацца — праз яго публікацыі ў «Звяздзе».

Плёну і натхнення зычаць прафесару звяздоўцы.

Сардэчна віншую **Вячаслава Рагойшу з юбілеем!** Жадаю моцнага здароўя, дабрабыту, жыццёвых радасцяў і творчага натхнення.

Сябра Пётр РОГАЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 15 июня 2012 года проводит 8-ой повторный открытый аукцион от 17 мая 2012 года и 9-ый повторный открытый аукцион от 31 мая 2012 года по продаже имущества республиканской собственности на 10-м открытом аукционе

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
86	Автошасси ГАЗ-66-15 ш. 0599508 дв. 225173-89 4 кат.	г. Дзержинск, в/ч 74962	1989	6 262 км	25 000 000	2 500 000
93	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8341353 на МАЗ-5334 ш. 55575 дв. 656319 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	46 446 км 993 м/ч	56 000 000	5 600 000
94	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8341389 на МАЗ-5334 ш. 55373 дв. 653793 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	18 908 км 470 м/ч	67 000 000	6 700 000
95	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8310131 на МАЗ-5334 ш. 47096 дв. 641837 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	43 427 км 3 221 м/ч	65 000 000	6 500 000
96	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8320654 на МАЗ-5334 ш. 51151 дв. 641599 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	78 202 км 635 м/ч	50 000 000	5 000 000
97	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8331145 на МАЗ-5334 ш. 54267 дв. 652021 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	2 138 км 20 м/ч	76 000 000	7 600 000
98	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А8330932 на МАЗ-5334 ш. 52202 дв. 645149 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	23 505 км 319 м/ч	67 000 000	6 700 000
99	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный) с/о А9010476 на МАЗ-5334 ш. 122696 дв. 784404 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1990	93 059 км 1 366 м/ч	89 000 000	8 900 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **15 июня 2012 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 12 июня 2012 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **15 июня 2012 г.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

Извещение о проведении аукциона № 8 опубликовано в газете «Звязда» № 74 от 17 апреля 2012 г., о проведении аукциона № 9 опубликовано в газете «Звязда» № 81 от 27 апреля 2012 г.

ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов

№ п/п	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Наименование инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)	Расходы по документации
1	д. Звериничи, участок № 6, кадастровый номер 623280803601000077	0,2089	Утверждена индивидуальная районная застройка	12 035 800	2 407 000	1 525 602
2	д. Звериничи, участок № 7, кадастровый номер 623280803601000076	0,2083	Утверждена индивидуальная районная застройка	12 001 200	2 400 000	1 525 602
3	д. Звериничи, участок № 9, кадастровый номер 623280803601000074	0,2208	Утверждена индивидуальная районная застройка	12 721 390	2 545 000	1 525 602
4	д. Звериничи, участок № 11, кадастровый номер 623280803601000072	0,2178	Утверждена индивидуальная районная застройка	12 548 500	2 510 000	1 525 602

Задаток перечисляется на р/счет № 3600619021104 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» МФО 153001601, УНП 600181697, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится **06.07.2012 г. в 10.00** по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, д. 14. Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 02.07.2012 г. до 17.00** по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, д. 14. Контактные телефоны: (8 01774) 58 2 35, 58 2 36, 56 4 98.

МГКУ дорожно-мостовое предприятие

ПРОВОДИТ ЗАПРОС ЦЕНОВЫХ ПРЕДЛОЖЕНИЙ

по закупке комбинированной машины для ямочного ремонта асфальтобетонных покрытий, дорожного полотна в количестве 1 ед. за счет средств местного бюджета.

Конечный срок подачи ценовых предложений – **12.00 12.06.2012 г.**

По условиям процедуры закупки и с предложениями обращаться по адресу: **212030, г. Могилев, ул. Габровская, 9; т/ф 8 0222 48 03 38,** адрес электронной почты **MGKUDMP@tut.by**

УНП 700265690

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ

о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Старина, Гончаровка Заболотского сельсовета, Смолевичского района, Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	**09 июля 2012 года, в 11.00,** аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1-а, Заболотский сельисполком, зал заседаний
3	Продавец и его адрес	Заболотский сельский исполнительный комитет, агр. Заболотье, ул. Купрейчика, д. 1-а
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	Лот № 1 — площадь 0,2268 га № 624882001601000281, д. Гончаровка Лот № 2 — площадь 0,2181 га № 624882006601000184, д. Старина
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания жилого дома
7	Начальная (стартовая) цена продажи	Лот № 1 — 99 193 650 рублей Лот № 2 — 60 859 200 рублей
8	Условия аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9	Наличие инженерной инфраструктуры	д. Старина — подъезд к участку, д. Гончаровка — энергоснабжение, газификация, водопровод, подъезд к участку
10	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, получатель – Заболотский сельисполком, р/с 3641018050090 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками	Каждый вторник в 10.00
13	Окончательный срок приема документов	04 июля 2012 года в 17.00
14	Контактные телефоны	8 01776 43 7 38, 43 0 16, 55 3 42

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения, подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

г. Клецк **5 июля 2012 года**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ И ПРОДАЖИ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Месторасположение земельного участка, кадастровый номер	Вид аукциона	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.)
1.	г. Клецк, ул. Победоносная № 62250100002002990 Арендодатель – Клецкий райисполком	на право заключения договора аренды	водопровод, газопровод, электроснабжение; канализация, асфальтированный подъезд	0,0327	20	Для строительства и обслуживания магазина	- возмещение потерь сельхозпроизводства в сумме 718 010 руб.	3 548 608	354 860	5 436 924

1. Аукцион состоится **5 июля 2012 г. в 11 часов** в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10.

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели, юридические лица, граждане Республики Беларусь.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников.

Участнику необходимо подать заявление в Клецкий райисполком. Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителями индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализованную в установленном порядке доверенность; граждане РБ представляют копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 204; последний день приема документов **4 июля 2012 г. до 11.00.** Заключительная регистрация участников **5 июля 2012 г. с 10.00 до 10.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3642207430706 в ЦБУ № 607 г. Клецк филиала № 620 г. Несвиж ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Клецка код 523. Получатель – Клецкий райисполком, УНП 600198162.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату на право заключения договора аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи. Контактные телефоны в Клецке: (8 01793), 54657, 50822.

Сайт www. kletsk.minsk-region.by

■ Во даюць!

ДАЕШ ПА СЕМ КНІЖНЫХ СТАРОНАК ШТОДНЯ!

Днямі ў Расіі стартавала рэкламная акцыя «Займайся чытаннем», ініцыяваная Федэральным агенцтвам па друку і масавых камунікацыях і Саюзам кнігагандляроў. Гэты праект стаў часткай Нацыянальнай праграмы падтрымкі і развіцця чытання, якая рэалізуецца ў Расійскай Федэрацыі на працягу апошніх пяці гадоў.



Асноўная ідэя акцыі заключаецца ў тым, што чытанне — не лёгкая забава, а сур'ёзная справа, якая вымагае самаддачы — вельмі падобная на спорт, таму класікі рускай літаратуры Пушкін, Гогаль і Талстой прадстаюць перад моладдзю ў вобразах спартыўных трэнераў....

У бліжэйшы час у эфіры федэральных тэлеканалаў з'явіцца відэаролік адрасаваны перш за ўсё юнакам, паколькі ў іх праблем з чытаннем больш, чым у дзяўчат. Менавіта таму ў запісы гучыць фраза: «Будзь мужчынам». Таксама падрыхтаваны і постары. На іх Пушкін у чырвоным спартыўным касцюме з эмблемай дуэльных пісталетаў і са свістком у роце заклікае моладзь пачынаць з невялікіх тэкстаў, паступова павялічваючы нагрузку. Чэхаў у сінім касцюме з эмблемай чайкі і секундамерам у руцэ абяцае: «Тры падыходы па сем старонак штодня — і вынік будзе заўважны праз тыдзень». Леў Талстой у касцюме падтрымлівае: «Не здавайся, на 500-й старонцы адкрыецца другое дыханне».

Аўтары ідэі рэкламнай кампаніі лічаць, што іх праект — спроба знайсці правільны тон у зносінах з тынейджарамі, якіх трэба прыцягнуць да кнігі, зрабіць яе адной з жыццёвых каштоўнасцяў падрастаючага пакалення.

Па звестках аўтарытэтнага міжнароднага даследавання PISA, здольнасці ўспрымаць, аналізаваць і асэнсоўваць тэкст у сучасных падлеткаў развіты недастаткова, і кампанія «Займайся чытаннем» — адна са спроб вырашыць гэтую праблему.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА

«Ой хораша куст вадзілі, каб людзі шчаслівы былі!»

У вёсцы Пласток, што на Любанскай зямлі, справілі ўнікальны старажытны абрад «Ваджэнне куста». Як кажуць мясцовыя, кожны год водзяць тут куст, «каб быў хлеб у доме, поле радзіла, у сараі вадзіла».

Па традыцыі, на другі дзень Троіцы ў вёсках пачыналіся гульбішчы: выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, рабілі яе Кустом (упрыгожвалі кляновымі ці бярозавымі лістамі і галінкамі, вяночкам) і вялі праз усё сяло. Ды нікога не міналі, бо Куст сімвалізаваў род, радавод. «Каго куст мінае, той ураджаю не мае» — жыве і дагэтуль павер'е пра цудадзейнасць сустрэчы з кустом.

— А ці прымеце куста? — пачыналіся размовы перад чарговай хатай. Тут жа, на ручніку з хлебам, яйкамі, грашыма, сустракалі гаспадары жанчын.

— Вось табе вяночак, каб быў сыночак! — Куст апранае на галовы гаспадароў кляновыя «ўпрыгажэнні».

Пасля абходу вёскі гурт накіроўваўся зноў да таго месца, дзе Куста пераапраналі. «Працэдура» паўтаралася ў адваротным парадку. Дзяўчаты ўпрыгожвалі бярозку, завівалі рознакаляровыя стужкі. А пасля — кідалі на дрэвы вянкі, «каб збыліся жаданні, на жыта густое, на гады добрыя».

Смачная яечня, карагоды, кумленне... Добра «павадзіўшы куста», сабраўшы частаванні і дарункі, удзельніцы «жаночага войска», нарэшце, садзяцца за святочныя сталы. І яшчэ доўга гучаць народныя песні-паданні...

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Любанскі р-н.

Усходні гараскоп на тыдзень

АВЕН. Вас наведае неверагоднае пачуццё волі. Магчыма, гэты перыяд стане паваротным у вашым жыцці. З'явяцца новыя жаданні, сілы для іх ажыццяўлення, новыя задумы. Вас нарэшце наведае доўгачаканае натхненне.

ЦЯЛЕЦ. Не варта баяцца прыступаць да рэалізацыі новых праектаў, яны прынясуць упэўненасць у сваіх сілах і фінансавую стабілізацыю. Пры рашэнні любых пытанняў выяўляйце такт і разважлівасць.

БЛІЗНЯТЫ. Рызыкуеце занадта позна ўспомніць адзін з жыццёвых урокаў, які мог бы дапамагчы. Сцеражыцеся неабдуманых паспешлівых учынкаў, нават калі для таго, каб прадумаць кожны крок, давядзецца не спаць начамі. Нядрэнна было б паназіраць за вашым асяроддзем, каб пасля мець правільнае ўяўленне пра людзей, з якімі давядзецца супрацоўнічаць.

РАК. Вельмі пажадана стрымліваць яхіднасць, нават калі будзе жаданне выдаваць каментары з любой нагоды. Вашу з'едлівасць запомняць надоўга, і многіх яна закране сур'езна, так што ў патрэбны момант вы можаце аказацца без падтрымкі толькі таму, што мелі неасцярожнасць ляпнуць нешта крыўднае.

ЛЕЎ. Назапашаныя за папярэдні перыяд цяжкасці і перашкоды, якія ўзніклі перад вамі, будуць на працягу гэтага тыдня паступова адыходзіць. Вас могуць заваліць працай. Перамесціце акцэнт ад бягучых праблем да хуткай камандзіроўкі. Будзьце ўважлівыя, бо памылкі і пралікі ў справах могуць выклікаць незадаволенасць у начальства. Некаторыя арганізацыйныя пытанні будуць вырашацца з цяжкасцямі, так што давядзецца засяродзіцца і прыкласці максімум намаганняў. Пажадана шырока не анансаваць свае планы і задумы, тады яны маюць шанц рэалізавацца.

ДЗЕВА. Вас чакае удалы ва ўсіх адносінах тыдзень, калі будуць атрымлівацца практычна любыя справы. У аўторак верагодныя пэўныя цяжкасці, але цалкам пераадольныя. Ваша фірмовая ўпартасць зараз не ў тэму — яна можа зацягнуць непрыемную сітуацыю на працяглы тэрмін або прывесці да рэзкіх непажаданых змен. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі, не выключана, што яна не ашукае вас, падказваючы спосаб рашэння праблем. Прызначаючы час для розных сустрэч, паспрабуйце ўлічыць верагоднасць рызыка-мажорных акалічнасцяў, каб усюды паспець.

ШАЛІ. Новыя праекты можна пачынаць з аўторка, тым больш што ваша сабранасць дазволіць тварыць цуды. Шанцаванне па дробязях стане крыніцай аптымістычнага настрою, што таксама вельмі паспрыяе вашай працаздольнасці. Серада дазволіць вырашыць ці пакінуць у мінулым шматлікія бескарысныя праблемы.

СКАРПІЁН. Старайцеся не марнаваць каштоўны час. Усё задуманае зможа ажыццявіцца, калі вы спакойна і старанна будзеце рабіць сваю справу. Перш чым складаць план дзеянняў, варта праверыць добранадзейнасць партнёраў. У другой палове тыдня можаце адчуць, што здольныя на многае, але ўсё ж лепш будзе засяродзіцца на самым галоўным, а дробязі не выпускаць з поля зроку.

СТРАЛЕЦ. Вас чакае вельмі напружаны графік; аб'ём клопатаў, як на працы, так і дома, значна павялічыцца, паглынуўшы больш, чым звычайна, вашага часу і ўвагі. Затое ўзрасце адчуванне ўпэўненасці ў сваіх сілах, з'явіцца жаданне дзейнічаць. Вы цалкам здольныя на нестандартныя рашэнні, і гэтая здольнасць вам спатрэбіцца. Фартуна ўсміхаецца вам бесперапынна, вызначаецца сур'ёзны поспех у кар'еры. Але не ўсё будзе бясхмарным — ёсць небяспека, што ваш аптымізм перарасце ў эйфарыю, а гэта ўжо можа мець не самыя лепшыя наступствы.

КАЗЯРОГ. Вы цудоўна выглядаеце і знаходзіцеся на вяршыні сваіх магчымасцяў. Так што ёсць рэальная надзея, што поспех ад вас не адвернецца. У панядзелак і чацвер верагодныя канструктыўныя і шматспадзеўныя дзелавыя сустрэчы. Калі пашанцуе, яны адкрыюць перад вамі новыя прывабныя перспектывы. У аўторак ваша павышаная працаздольнасць дазволіць справіцца са шматлікімі назапашанымі справамі. Вынікі ж шмат у чым будуць залежаць ад вашай акуратнасці і засяроджанасці.

ВАДАЛЕЙ. Тыдзень спрыяе інтэлектуальнай дзейнасці і роздумам пра высокія матэрыі. Не купляйцеся на ліслівасць, гэта можа дорага абысціся. Сустрэча са старымі сябрамі ў першай палове тыдня адкрые перад вамі новыя перспектывы. У чацвер і пятніцу лепш не ажыццяўляць ніякіх кардынальных змен, усё важнае для сябе пачынайце з суботы.

РЫБЫ. Настае спрыяльны час для пераасэнсавання сваіх паводзін і дасягненняў. Новы погляд на рэчы дапаможа сфармуляваць новыя ідэі. У вашых сілах змяніць у лепшы бок адносіны з навакольным светам. Чакайце цікавай інфармацыі, якая дазволіць вам, выкарыстоўваючы свае сувязі і магчымасці, прасунуцца па кар'ернай лесвіцы. Не забывайцеся пра блізкіх людзей, паспрабуйце надаць ім належны час і ўвагу.

У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

Прафесар Нікалаеў расказаў пра адну са сваіх прафесійных знаходак – дакументы па судовай справе 1624 года. Абвінавачвалася жанчына, якая «з дапамогай чараўніцтва намервалася пазбавіць мужчынскай сілы» важнага пана з роду Сапегаў...

Даты. Падзеі. Людзі

Сусветны дзень навакольнага асяроддзя. Усталяваны рашэннем Генеральнай Асамблеі ААН ад 15 снежня 1972 г. у дзень адкрыцця Канферэнцыі ААН па праблемах акаляючага чалавека асяроддзя (Стакгольм, 5-16 чэрвеня 1972 г.).

Дзень памяці святой Ефрасінні Полацкай.

1854 год — нарадзіўся Юдэль Майсеевіч Пэн, мастак-жывапісец, педагог, выбітны дзеяч «яўрэйскага рэнесансу» ў беларускім мастацтве пачатку XX стагоддзя. У 1886-91 гадах працаваў у гарадах Латвіі. З 1891-га жыў у Віцебску. У 1897 годзе стварыў Віцебскую школу-майстэрню, у 1918-23-м кіраваў майстэрняй у Віцебскім народным мастацкім вучылішчы. Сярод вучняў — М. Шагал, З. Азгур. Працаваў пераважна ў жанры кампазіцыйнага партрэта, а таксама пейзажу, тэматычнай карціны. У сваёй творчасці развіваў лепшыя традыцыі рэалістычнага жывапісу канца XIX стагоддзя. Сярод карцін: «Вуліца у Віцебску», «Стары салдат», «Ліст з Амерыкі», «Стары з кошыкам» і многія іншыя. Мастак быў забіты ў сваёй хаце ў Віцебску ў ноч з 28 лютага на 1 сакавіка 1937 года. Акалічнасці забойства не высветлены дагэтуль. Паводле версіі тагачаснага расследавання, прычынай забойства быў напад з мэтай рабавання. Пасля смерці Пэна ў Віцебску была створана яго галерэя жывапісу. Цяпер працы мастака захоўваюцца ў Віцебскім мастацкім музеі і Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

1783 год — прадпрымальнікі і вынаходнікі браты Жазэф і Эцьен Мангальф'е на рынкавай плошчы невялічкага французскага гарадка Анона ўпершыню публічна выпрабавалі аэрастат. Паветраны шар з абалонкай з палатна і вяровачнай сеткі падняўся на вышыню 1800 метраў. Экіпажа не было. У верасні таго ж года на «мангальф'еры» — так сталі называць гэтыя шары — у паветра былі «запушчаны» баран, певень і качка, якія шчасліва прызямліліся на лузе. А 21 лістапада 25-хвілінны палёт упершыню здзейснілі людзі — французы Пілатр дэ Разье і яго сябар маркіз дэ Арланд.

1937 год — нарадзіўся (г. Мінск) Валянцін Паўлавіч Занковіч, беларускі архітэктар і скульптар. У 1960-70 гадах працаваў у інстытуце «Мінскпраект». Асноўныя працы: мемарыяльныя комплексы «Хатынь», «Брэсцкая крэпасць-герой», «Кацюша», помнік «Мінск— горад-герой», кампазіцыя «Бег» на стадыёне «Дынама» і іншыя. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1967), Ленінскай прэміі (1970).

Было сказана

Васіль Быкаў (1924—2003), пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч:

«Не перамогшы ў сабе карыслалюбца, баязліўца, не пераможаш ворага. Гэта пытанне жыцця і пытанне гісторыі».

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.



Іх імёны звязаны з Беларуссю

Па гарызанталі: 1. Бяздымны..., або балістыт. Выбуховае рэчыва, якое, як і дынаміт, вынайшаў шведскі хімік-эксперыментатар, бізнэсмен Альфрэд Нобель: прэміямі яго імя штогод, 10 снежня, узнагароджваюцца выдатныя вучоныя, літаратары, палітыкі свету. **7.** ... — Крукоўская. Дзявочае прозвішча першай у свеце жанчыны-прафесара Соф'і Кавалеўскай, бацька якой паходзіў са старажытнага шляхецкага роду з Беларусі. **8.** Горад на Гродзеншчыне, малая радзіма бацькоў англійскага вучонага-біяхіміка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па хіміі (1982) Аарона Клуга. **9.** Драматычны твор. **10.** Аўтар паэтычных твораў: ім быў трэці прэзідэнт Ізраіля Залман Шазар, ураджэнец г.п. Мір Карэліцкага раёна. **11.** Вузкі трохвугольны флажок . **12.** Шымон .... Былы прэм'ер-міністр, дзявяты прэзідэнт Ізраіля, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1994 г.), ураджэнец вёскі Вішнева Валожынскага раёна. **13.** Вёска на Лагойшчыне, цэнтр сельсавета, радзіма Ганны Уладзіміраўны, маці буйнога расійскага вучонага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па фізіцы (2000) Жарэса Алфёрава: яго бацька — ураджэнец г. Чашнікі (Віцебшчына). **17.** Частка павозкі, аўтамашыны. **18.** Горад на Брэстчыне: тут прайшлі дзіцячыя гады былога прэм'ер-міністра Ізраіля Голды Меір; гэта малая радзіма бацькі амерыканскага вучонага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1995) Фрэдэрыка Райнеса; у гэтым горадзе нарадзіўся буйны амерыканскі вучоны-эканаміст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі (1971) Сайман Кузнец. **19.** Леанарда да ... .Геніяльны італьянскі мастак і вучоны эпохі Адраджэння: выдаў першыя ў свеце чарцяжы «пятушкалётаў» — першых лятальных апаратаў. **20.** «... Алфёрава». Кароткаметражны фільм , створаны на кінастудыі «Беларусьфільм» сцэнарыстам і кінарэжысёрам Уладзімірам Марозам. **22.** Горад на Міншчыне, малая радзіма заснавальніка яўрэйскай класічнай літаратуры Сфорыма Мендэле. **23.** Аляксандр... Буйны расійскі вучоны, адзін з вынаходнікаў радыё. **25.** Паўночнаамерыканскі мядзведзь. **28.** ... Твэн. Амерыканскі пісьменнік, які першы ў свеце прынёс у выдавецтва кнігу («Прыгоды Тома Сойера») у машынапісным выглядзе. **29.** Горад на Каўказе, дзе бацька Альфрэда Нобеля працаваў на нафтапромыслах. **30.** Патаўшчэнне штрыха пры пісьме пяром. **31.** Буйная вёска ў Іванаўскім раёне, малая радзіма вучонага-хіміка, першага прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Хаіма Вейцмана. **32.** Камплект друкарскіх літар; стваральнікам яго быў нямецкі вынаходнік Іаган Гутэнберг (канец XIV ст.).

Па вертыкалі: 2. Устаноўка, у якой адбываецца фізічная або хімічная рэакцыя. **3.** Званне, якое надаецца буйнейшым вучоным, мастакам і інш. **4.** Буйны беларускі горад, у якім нарадзіўся бацька амерыканскага вучонага Рычарда Фейнмана, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1965), аднаго са стваральнікаў амерыканскай атамнай бомбы. **5.** Сукупнасць з'яў, што ідуць адна за другой. **6.** Горад на Магілёўшчыне, малая радзіма бацькоў амерыканскага вучонага Шэлдана Лі Глэшоў, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1979). **11.** Буйны беларускі горад, малая радзіма бацькоў амерыканскага вучонага Алана Хігера, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па фізіцы (2000). **14.** Вядомы раман польскага пісьменніка Генрыка Сянкевіча, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1905): пісьменнік доўгі час жыў і працаваў над сваімі творамі на Астраўечыне. **15.** Сучасная мадыфікацыя старажытнаяўрэйскай мовы, якую распрацаваў ураджэнец вёскі Лужкі (Віцебшчына) Элііэзэр Бен-Іегуда (Лазар Перэльман). **16.** Востраканечны стрыжань, якім завяршаецца верх будынка. **19.** Печ для выпальвання вапны. **21.** Тэадор ... 26-ы амерыканскі прэзідэнт, гісторык, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1906). **24.** Горад на Брэстчыне, у якім нарадзіліся бацькі амерыканскага вучонага Марціна Перла, лаўрэата Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1995). **26.** Буйны беларускі горад, малая радзіма былога прэм'ер-міністра Ізраіля, аратара, паліглота Менахема Бегіна, лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру (1978). **27.** Вучы ... і вучыся ад народа (прык.).

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Порах. 7. Кюрі. 8. Зальва. 9. Песа. 10. Пакт. 11. Вымер. 12. Перэс. 13. Краіна. 14. «Крыжакі». 15. Ібыт. 16. Шпіль. 19. Вагельнья. 21. Ананьмік. 4. Мінск. 5. Шэкспір. 6. Бабруйск. 11. Віцебск. 17. Кузьў. 18. Пінск. 19. Вінчы. 20. Лазер. 22. Кавыль. 23. Ганоў. 25. Грызлі. 28. Марк. 29. Баку. 30. Нальік. 31. Мотыль. 32. Шрыфт. **Па вертыкалі:** 2. Рэактар. 3. Акадэмік. 4. Мінск. 5. Шэкспір. 6. Бабруйск. 11. Віцебск. 14. «Крыжакі». 15. Ібыт. 16. Шпіль. 19. Вагельнья. 21. Рувім. 24. Пружаны. 26. Брэст. 27. Нарад.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.41	21.36	16.55
Віцебск	4.23	21.33	17.10
Магілёў	4.31	21.26	16.55
Гомель	4.37	21.13	16.36
Гродна	4.58	21.49	16.51
Брэст	5.08	21.41	16.33

Месяц

Поўня 4 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Андрэя, Івана, Канстанціна, Міхаіла, Пятра, Фёдара, Якава.*

К. *Валерыі, Зінаіды, Кіры, Баніфата, Дарафея, Ігара.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+15..+17°С	КІЕЎ	+24..+26°С	РЫГА	+14..+16°С
ВІЛЬНЮС	+13..+15°С	МАСКВА	+19..+21°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+14..+16°С

УСМІХНЕМСЯ

Пасля поспеху «Буранаўскіх бабуль» на «Еўрабачанні-2012» было вырашана адправіць «Буранаўскіх дзядуляў» на чэмпіянат свету па футболе-2014.

Муж скардзіцца прыяцелю:

— Жонка брунеткай была, учора раніцай пафарбавалася ў бландзінку, а ўвечары ўчыніла скандал: «Адкуль у ложку чорныя валасы?»

«А ці не пайсці мне на працу?» — падумаў я. І не пайшоў.

Званок у 4 раніцы: «Алё! А ў вас статак аленяў не прабягаў?»

Спакойны адказ: «А ты што, адстаў?»

Малюнак Марыны ГАРЭЛАВАЙ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.765. Індэкс 63850. Зак. № 2526.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 4 чэрвеня 2012 года.